Басовішча 2004 ☞ 3



Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

МІХАЛ ПОЛЕХ ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 27 (2512) Год XLIX | Беласток, 4 ліпеня 2004 г. | Цана 2,00 зл.

У апошнія гады, калі дзеці з беларускіх класаў пачалі дасягаць найлепшыя вынікі ў навуцы і мастацкіх конкурсах, урокамі пацікавіліся палякі і бацькі з польска-беларускіх сем'яў...

Запрацавалі добрую славу!

— У першы клас гімназіі запісалася ўжо сем асоб, — кажа Аліна Ваўранюк, настаўніца беларускай мовы ў Беластоку.

Хоць лік першакласнікаў-гімназістаў сціплы — усё ж поспех. Большасць іх не хадзіла ў „чацвёрку". Дарэчы, у гэтай узроставай групе, як ніколі, былі праблемы з арганізаваннем урокаў. Працягам шасці гадоў родную мову ў ПШ н-р 4 вывучалі толькі тры вучаніцы.

Аднак не колькасць тут важная! Дзяўчаты ўсе (на чатыры асобы ў класе) атрымалі пасведчанні з бела-чырвонымі палоскамі, а іх бацькі віншавальныя граматы. Аня Яканюк і Магда Саковіч закончылі шосты клас з сярэдняй ацэнкай 5,5, Оля Максімюк 5,0. За шэсць гадоў прынеслі яны школе многа ўзнагарод, у першую чаргу за ўдзел у беларускіх конкурсах. Аня Яканюк, вядомая сярод грамады як старшыня школьнага камітэта.

Зараз дзяўчаты запісаліся ў беларускі клас Гімназіі н-р 7, што па вуліцы Сталэчнай. Разам, у першым і другім класах (трэцяга пакуль няма) будзе 20 навучэнцаў. Варта дадаць, што сярод нашых сяброў на ўрокі ходзіць дзяўчына мараканска-польскага паходжання Ясміна Абоў-Гіляль.

— У гэтым годзе ўсе нашы выпускнікі пойдуць у „чацвёрку", — інфармуе Луцыя Няміровіч, дырэктар Польска-беларускага садка н-р 14.

У „чацвёрцы" ўсё ж спадзяюцца, што, апрача васьмі выпускнікоў садка, дойдуць іншыя. Асабліва ў апошнія гады, калі дзеці з беларускіх класаў пачалі дасягаць найлепшыя вынікі ў навуцы і мастацкіх конкурсах, урокамі пацікавіліся палякі і бацькі з польска-беларускіх сем'яў.

Найлепшы ў школе V „а" клас — гэта асаблівы клас на карце Беластока. Раз, што найбольш навучэнцаў беларускай мовы, ды яшчэ ў ім больш праваслаўных як католікаў. Сярод 12 вучняў, якія атрымалі пасведчанні з бела-чырвонымі палоскамі — аж 9 з беларускай групы! Самыя высокія дасягненні ў навуцы заваявала Наталля Кандрацюк-Свярубская, ў якой сярэдняя ацэнка 5,6. Наталля — фіналістка прадметнага конкурсу беларускай мовы. У ліку згаданых выдатнікаў апынуліся: Марыюш Врублеўскі, Оля Каліна, Аляксандр Ваўранюк, Мацей Карчэўскі, Оля Паўлючук, Алекс Мазурук, Эмілія Мусько і Матфей Севастыянік.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Аліна Ваўранюк: За гады навукі мы запрацавалі добрую славу. Нашы дзеці наогул найлепшыя вучні ў школе... (ад бацькоў настаўніцы дзякуе Юры Каліна)

Нашы выдатнікі і іх бацькі атрымалі яшчэ процьму дыпломаў і віншаванняў за ўдзел у беларускіх конкурсах і за працу ў карысць школы.

— Якія ў нас дасягненні? — пералічвае найважнейшыя Аліна Ваўранюк. — За гады навукі мы запрацавалі добрую славу. Нашы дзеці наогул найлепшыя вучні ў школе.

Падобная справа і з бацькамі. У мінулым годзе мы на ўласны кошт арганізавалі і абсталявалі клас для навучання беларускай мовы. Бацькі памалявалі сцены, купілі столікі і крэслы, табліцы, дапаможнікі. Дзякуючы ім і спонсарам купілі яшчэ камп'ютэр і іншую тэхніку. Вялікай падзеяй лічым таксама экскурсію ў Беларусь. На вандроўку, якая адбылася напрыканцы школьнага года, паехалі дзеці і гімназісты з бацькамі. Наведалі Гродна, Мір і Навагрудак.

Вядома, шмат тут поспехаў у мастацкіх конкурсах і прадметным па беларускай мове.

— З гэтага года, — адзначае настаўніца, — мы ўручаем узнагароду нашаму найлепшаму вучню. Уфундаваў яе амбасадар Беларусі. Сёлета, такую ўзнагароду CD-плэер (odtwarzacz kompaktowy) атрымала Оля Максімюк.

Выхаваўча-мастацкая праца будзе працягвацца ў час канікул. На пачатку ліпеня беластоцкія навучэнцы паедуць на этнаграфічны летнік у Белавежу. А я, — кажа Аліна Ваўранюк, — праз лета буду працаваць над падручнікам беларускай мовы для I-III класаў.

З верасня ў беластоцкай „чацвёрцы" будзе за пяцьдзесят навучэнцаў беларускай мовы.

— Да нас таксама запісалася ўжо 50 дзетак, — чую ў беларускім прадшколлі. Гэта рэкордная колькасць у гісторыі садка. Прытым рэклама ідзе прыватным каналам. Бацькі захвальваюць прадшколле сваім знаёмым і сваякам. З другога боку, садок дасягнуў многа ўзнагарод у тэатральных, пластычных, спявачых, дэкламатарскіх конкурсах. Прытым узнагароды і прызы дзеткі атрымалі не толькі ў беларускіх спаборніцтвах. Яны, згодна з духам прадшколля, паказваюць свае спектаклі і песні на беластоцка-польскіх мерапрыемствах і заваёўваюць там галоўныя прызы.

Ганна Кандрацюк

Вынікі галадоўкі ☞ 2

Уладзімір Лапцэвіч

Крыху папсаваўшы ўласнае здароўе былыя галадоўшчыкі абвясцілі аб спыненні галадоўкі і так званым новым этапе акцый пратэсту — 21 ліпеня, калі прэзідэнцтву А. Лукашэнкі спаўняецца роўна 10 гадоў. Прыняць удзел у гэткіх акцыях дзеяннях дэпутаты заклікаюць, зразумела, усіх каму не абыякавы лёс Беларусі. Не хочацца прагназаваць ці ўдасца дасягнуць чаго-небудзь важкага парламенцкім апазіцыянерам праз некалькі тыдняў...

Прэзідэнціха ☞ 4

Мацей Халадоўскі

Першы раз у Беластоку пабывала першая дама Рэчы Паспалітай, жонка прэзідэнта Іаланта Кваснеўская. Пусціла ў рух новае абсталяванне для радыетэрапіі ў анкалагічнай бальніцы, наведала дзяцей з паталагічных сем'яў у Згуртаванні „Наш дом", прыняла ўдзел у агульнапольскім з'ездзе асоб жывучых са СНІДам (былі і госці з Беларусі)...

Развітанне са школай ☞ 5

Аляксей Мароз

Выпускнікі Гайнаўскай беларускай гімназіі разам са сваімі малодшымі сябрамі і ліцэістамі развіталіся са школай 25 чэрвеня ў час урачыстых лінеек. На мерапрыемствах прысутны былі настаўнікі і бацькі. Выдатнікі па вучобе атрымалі з рук дырэктара Яўгена Сачко пасведчанні з чырвонай паласой і кніжныя ўзнагароды...

Пленэры і выстаўкі ☞ 8

У канцы мая ў „Слаўконіі" каля Скупава праходзіў мастацкі пленэр з удзелам гайнаўскіх і варшаўскіх мастакоў. Дадаткова прымалі ў ім удзел гімназісты з Нараўкі. Уласнікам маёнтка „Слаўконія" з'яўляецца Славамір Галёнка з Гайнаўкі, які цяпер жыве ў Варшаве. Месца пленэру знаходзілася сярод маладога лесу. Вучні выконвалі там раслінныя матывы ў гіпсе і малявалі краявіды...

Беларуская ліга ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

У першыя гады флагманства захоўвала мінскае „Дынама" — своеасаблівая „зборная рэспублікі". Цягам першых сямі чэмпіянатаў сталічны клуб выйграў 6 залатых узнагарод. Першай гегемонію мінчукоў спыніла мазырская „Славія" ў 1996 годзе (тады каманда выступала пад жахлівай абрэвіятурнай назвай МВКЦ). Пазней мазырцы здабылі яшчэ адзін чэмпіёнскі тытул. Два разы першым фінішаваў таксама барысаўскі БАТЭ, які ніжэй трэцяга месца ў розыгрышах яшчэ не апускаўся...

9 770546 196000

Крызіс як балбатня

Час ападае як пялёсткі снегу, — любіць паўтараць мой знаёмы паэт-постмадэрніст. Як перажыць сучаснасць, калі нашай рэчаіснасцю, чалавечай, ёсць тое, што мінула, значыць, падзеі, гісторыя ды тое, што мае надысці. Як быццам нашым лёсам было ступаць па вастрыі ляза.

Мой знаёмы паэт-постмадэрніст, калі мінаціся мы на вуліцы, заявіў: — А не казаў я? Ёсць якраз так, як табе гаварыў. — Аб чым гаварыў? — Аб крызісе, у якім мы пагружаны. — Не разумею. — Так яно і ёсць, кожны бачыць. Глабалізацыя, якая нясе нам знішчэнне, распад структур дзяржавы, падзенне культуры ў адносінах да ўціскаючайся ў публікатары камерцыйнай сечкі, хваля злачынасці і да гэтага падобнае, — і пабег далей, не выслухаўшы мае думкі на гэты конт.

Я яму зайздросціў. Было ў ім моцнае пачуццё сілы і праўды, што, здавалася, панаваў ён над сіламі натуры.

Вось, адчуванне крызісу не такое і паўсюднае. Наш час, з-пад знаку Еўропы, здаецца рухацца па простай лініі, якая ўздымаецца ад мінуласці да будучыні. Гэта час вечнай перамены; гэта час, да якога стараюцца нас прыручыць тыповыя для нашай цывілізацыі дасягненні навукі. А з прадуктамі сучаснай тэхнікі знакаміта спраўляюцца шматлікія пакаленні. Ды мой сябра, постмадэрніст, лічыць, што лінеарны час — прадукт гнілога Захаду; час рэальны і прыязны чалавеку павінен разліваціца ў нерэгулярную крывуліну.

Але і навуковая думка дайшла да вываду, што чакае нас, чалавецтва, несумненнае знішчэнне, да якога, без сумненняў, дойдзе праз некалькі мільёнаў гадоў, калі наша родная зорка — Сонца, без сумненняў, пабольшыцца, узарвецца, каб паглынуць у пякельным агні ўсе планеты нашай сістэмы. Што тады стане з чалавецтвам, ніхто не ведае, апрача жменькі прарокаў. Для жывучых тут і зараз зямлян такое меркаванне — абстракцыя, якою ніхто са здаровымі глуздамі не павінен пераймацца. Перажываць хутчэй трэба за арсеналы зброі канкрэтных краін, калі не канкрэтных тэрарыстаў.

Усё ж, калі з одумам нахілімся над бязмежжам мінулага часу, лёгка сканстатаваць, што свядомасць паўсюднага крызісу ў нашым культурным крузе прысутная ад заўсёды. Ужо грэчаскі мудрэц Платон у V ст. да нараджэння Хрыста прадказваў схіл грэчаскай цывілізацыі і на парозе крызісу патрабаваў сарганізаваць моцную дзяржаву, сёння назвалі б мы яго ідэю таталітарнай дзяржавай. Гэта праблема выкарыстання насілля ў адносінах да асоб, супраць іх волі, каб іх ратаваць ад гібелі. Ці, можа, лепш прыглядацца збоку, бясчынна, пасіўна, са скептычнай усмешкай, іхняй самазагубе.

Веставанне схілу Захаду моднае было асабліва ў мінулым XX стагоддзі; займаліся ім такія ўплывовыя аўтары як Мікалай Бярдзяеў, Освальд Спенглер, Арнольд Тойнбі ці Леў Гумілёў, прытым паслядоўнікі веры ў крызіс паходзілі, цікавая справа, з кругоў як крайне левых, так і правых. Праўдападобна, згодна з прынцыпам самаадмяняючыхся супярэчнасцей.

Разам з пачаткам новага тысячагоддзя настроі дэкадансу становяцца рэальнымі як пачуцці постмадэрнізму, што для мяне асабіста — надуманае, літаратуршчына, штучнасць, якая шалясціць паперай, выраб тэкстаў пра тэксты.

Паводле постмадэрнізму, а хутчэй таго, што за постмадэрнізм паўсюдна прымаецца, я, асоба, „самаіснасць", свядомасць, чалавечая адзінка ў сваёй сутнасці не існуе, яна толькі выдумка, твор, калі рэальныя — структуры шырэйшыя, якія чалавека абмяжоўваюць і суставараюць. Філосаф-постмадэрніст Мішэль Фуко ўжыў нават вызначэнне „смерць чалавека".

Усё ж, у самаіснасць безупынна трапляем, быццам павук ва ўласную сетку, незалежна ад спроб забыцца аб сабе, аб сваіх правах і сваіх абавязках, заданнях.

Ежы Плютовіч

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Наш час здаецца рухацца па простай лініі, якая ўздымаецца ад мінуласці да будучыні...

Вынікі галадоўкі

Літаральна некалькі нумароў назад з'явіўся на старонках „Нівы" мой артыкул „Адраджэнне надзеі". Гаворка ішла аб траіх дэпутатах беларускага парламента, якія абвясцілі галадоўку патрабуючы: недапушчэння магчымасці А. Лукашэнку насуперак Канстытуцыі ў трэці раз балатавацца на пост прэзідэнта краіны, унясення дэмакратызуючых змен у выбарчае заканадаўства напярэдадні восеньскіх парламенцкіх выбараў, а таксама вызвалення вядомага палітыка і дыпламата Міхаіла Марыніча, якога абвінавачваюць у крымінальных злачынствах фармальна не звязаных з ягонай апазіцыйнай дзейнасцю. І вось 21 чэрвеня галадоўка была спынена.

Звычайна спыненне такога кшталту акцый абумоўліваецца наступнымі прычынамі — задавальненнем патрабаванняў галадуючых альбо, як бы гэта не было цынічна, смерцю ўдзельнікаў. У нашым выпадку нічога такога не здарылася. Крыху папсаваўшы ўласнае здароўе былыя галадоўшчыкі абвясцілі аб спыненні галадоўкі і так званым новым этапе акцый пратэсту — 21 ліпеня, калі прэзідэнцтву А. Лукашэнкі спаўняецца роўна 10 гадоў. Прыняць удзел у гэткіх актыўных дзеяннях дэпутаты заклікаюць, зразумела, усіх каму не абыякавы лёс Беларусі. Не хочацца прагназаваць ці ўдасца дасягнуць чаго-небудзь важкага парламенцкім апазіцыянерам праз некалькі тыдняў, бо цікавяць вынікі менавіта прайшоўшай іхняй галадоўкі. А яны, на першы погляд, нясуць у сабе больш адмоўнага чым станоўчага, як для саміх дэпутатаў, так і для парэшткаў беларускай дэмакратыі ў цэлым. Але толькі на першы погляд.

Што маем на сённяшні дзень. Першае — Палата Прадстаўнікоў падаўляючай большасцю (71 супраць 8) адмовілася прымаць папраўкі ў Выбарчы кодэкс. Другое — Міхаіл Марыніч застанецца ў турме, чакаючы заканчэння следства, яшчэ сама мала на два месяцы (акурат праз 4 дні пасля спынення галадоўкі пра гэта абвясціў Камітэт дзяржаўнай бяспекі). „Накранутым" застаецца пакуль толькі адно — трэці тэрмін Лукашэнкавага прэзідэнцтва. Гэта самы галоўны і таму самы далікатны момант ва ўсёй беларускай палітыцы — як унутранай, так і знешняй. А яшчэ больш важна тое, што развязваць гэтую праблему нават не беларускай уладзе, а менавіта пакуль дзеючаму прэзідэнту трэба ў самы бліжэйшы час.

Пэўна ў жыцці кожнага чалавека бывалі такія моманты, калі хочацца крыкнуць часу „Спыніся! Хай так, як ёсць цяпер, будзе назаўсёды, назаўжды, ва векі вякоў!" Бо разумееш, што як бы не было добра далей, не будзе так хораша як у гэтыя хвіліны, гадзіны, дні, гады.

Падаецца, што менавіта нешта падобнае адчувае і А. Лукашэнка, першы беларускі прэзідэнт, які ўжо дзесяць гадоў практычна непадзельна кіруе краінай. Ён яшчэ адносна малады (усяго крыху больш за 50 гадоў), вельмі амбітны, але ў той жа час вычарпаўшы сябе палітык. Ягоная палітыка збанкрутавала на ўсіх напрамках — дачыненне да большасці краін-суседзяў, што жывуць у эпоху глабалізацыі і паглыблення эканамічна-палітычных узаемасувязей, часцей чыста геаграфічнае, стасункі з тым, каму штогод шмат разоў кляўся ў любві і братэрстве — Расіяй, сапсаваныя фінансава-эканамічнымі непаразуменнямі і нежаданнем апошняй прызнаваць „роўнасць" сабе Беларусі і яе прэзідэнта. Ды і ў народзе не надта папулярная ідэя пажыццёвага кіравання дзяржавай, бо прывучаныя людзі лічыць героямі тых, хто калісьці цара скідаў.

Зразумела, правесці рэферэндум, які б адмяніў „двухтэрміновае" абмежаванне, няцяжка. Няцяжка і „выйграць" наступныя прэзідэнцкія выбары. Сістэма маніпуляцый як выбарчымі бюлетэнямі, так і грамадскай думкай у Беларусі даведзеная, здаецца, да ідэалу. Але што далей? Рэферэндум з большага засведчыць толькі наступнае — нежаданне цывілізавана перадаваць уладу і фактычную знявагу ўласнаручна калісьці напісанага Лукашэнкам Асноўнага закону дзяржавы. А ці не падштурхне гэта кагосьці з прэзідэнцкага атачэння да адмовы гуляць па правілах Гаспадара, тым больш што прычын для такога развіцця падзей нават на сёння дастаткова? З усімі, як кажуць, выцякаючымі адсюль наступствамі.

Не праводзіць рэферэндум таксама нельга. Бо як інакш можна працягнуць уладаранне, ведаючы, што не маеш нават непрызнаных іншымі доказаў „усенароднай" падтрымкі?

Найлепшым падаецца выйсце для цяперашняга беларускага прэзідэнта — пераход на працу на якую-небудзь пасаду ў якойсьці міждзяржаўнай арганізацыі. Такіх на тэрыторыі былога СССР паўстала шмат — яны амаль нічога не значаць, але існуюць. Праўда, з амбіцыямі трэба будзе нешта рабіць, бо вясельны генерал гэта не вярхоўны галоўнакамандуючы.

Праўдападобна, дэпутаты-галадоўшчыкі дабіліся адной сур'ёзнай рэчы — прадставілі сябе як галоўных натхняльнікаў супраціўлення трэцяму тэрміну. Можа яны асядлалі час?

Уладзімір Лапцэвіч

Вачыма еўрапейца

Улада любой цаною

У час перадапошняй сесіі ваяводскага сейміка падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі сухой ніткі не пакінуў на віцэ-старшыні ўправы з кааліцыйнага клуба Падляшская народная ініцыятыва (PIL) Яне Камінскім. Грымеў, што той беспрытомна заязджаў службовую машыну, не пастараўся выкарыстаць некаторыя еўрапейскія сродкі, шмат закідаў у яго адрас паставіла Галоўная кантрольная палата (NIK). На канец даў прапанову аб яго адкліканні, якая была прынята. Камінскі разам з клубнымі калягамі і калегам (віцэ-старшынёй сейміка ад PIL Антоні Ціхоцкім) перайшлі на бок правай апазіцыі. Гэтым самым кіруючая кааліцыя на чале з СЛД страціла ў сеймику большасць. Правым тады ўдалося адлікаць левага старшыню сейміка Збігнева Кшывіцкага і ПСЛеўскага віцэ-старшыню Адама Дабронскага. На іх месцы былі прызначаны адпаведна Кшыштаф Путра з Грамадзянскай платформы (PO) і Марэк Васілеўскі з Лігі польскіх сем'яў (LPR). На працягу месяца стаўся цуд. На апошняй сесіі аказалася, што Ян Камінскі — „у парадку" і маршалак Кшыжэўскі нанова запрапанаваў яго кандыдатуру на віцэ-старшыню ўправы. Маршалку перасталі мяшаць закіды, якія сам пару тыдняў раней катэгарычна публічна паставіў. У цень пайшлі ягоныя дзеянні, якія зачапляліся ўжо за пракурорскія допыты. Правіца, якой здалося, што ўжо перахоплівае ўладу ў ваяводстве, аслупянела.

— Пан Камінскі, нават парадачны пастух два разы не вяртаецца ў сваю вёску, — гаварыў радны Пётр Зарэмба з LPR.

— Гэта кабарэтнае трактаванне сейміка, — дадаў Кшыштаф Путра.

Сам маршалак Кшыжэўскі прызнаўся перад тэлекамерамі:

— Я свядомы, што сітуацыя не ёсць нармальнай.

Не сказаў ён, аднак, што па сутнасці справа была ва ўтрыманні старога ўкладу, захаванні ў сеймику большасці. Няважнымі сталі выказаныя словы, дакляpацыі. Слова маршалка ў гэты дзень страціла якую-небудзь вартасць.

Вельмі трапна пракаментаваў гэтую сітуацыю на інтэрнэтавым форуме „Выбарчай газеты" адзін чытач:

— Вось якая думка прыйшла мне ў галаву пасля прачытання артыкула аб плёне прац беластоцкага сейміка — ці Беласток гэта не раптам раён Харошчы?

Для незарыентаваных спяшаюся растлумачыць, што вымаўляючы назоў гэтай шаноўнай мясцовасці маецца на думцы псіхбальніца. Іншы чытач напісаў:

— Пан Камінскі прынамсі раз аказаўся быць аператыўным, каб узлезці на крэсла.

Мабыць, так яно і ёсць. Для мяне, аднак, найважнейшае ў гэтай сітуацыі — становішча маршалка Кшыжэўскага, які будзе прымушаны моцна старацца, каб вярнуць сабе публічны давер, веру ў тое, што ягоныя словы што-небудзь значаць. Але, вернемся да апошняй сесіі сейміка. Паколькі, дзякуючы прызначэнню на віцэ-маршалка нанова Яна Камінскага, усё вярнулася да „нармальнасці" (чытай: наступіла рэканструкцыя старога ўкладу), кіруючым удалося вярнуць на пасаду старшыню сейміка Збігнева Кшывіцкага. На месца нелаяльнага Антоні Ціхоцкага пакліканы быў Ян Зенюк (актыўны дзеяч арганізацыі праваслаўных). На найбліжэйшай сесіі, мабыць, будзе назначаны яшчэ адзін віцэ-старшыня ад кааліцыйнага ПСЛ.

Яшчэ тыдзень пазней СЛД у Варшаве ўдалося прызначыць на пасаду прэм'ера Марка Бэльку.

Мацей Халадоўскі

На „Басовішчы” заўсёды прысутнічала рок-музыка і так павінна застацца. „Басовішча” даказвае, што сёння можна іграць рок з вялікай заангажаванасцю і многае дасягнуць. Прыклад — конкурсныя гурты. Сумна, што сёлета не заявілі ахвоты выступаць на конкурснай сцэне гурты з Падляшша...

Фестываль „пойдзе ўперад”

23-24 ліпеня 2004 г. у гарадоцкім „Барыку” адбудзецца XV Фестываль музыкі Маладой Беларусі „Басовішча 2004”. Са старшынёю Беларускага аб’яднання студэнтаў ды кіраўніком Фестывалю Ілонай КАРПЮК размаўляе Татка Стэп.

Фота МІХАЛА КОСЦЯ

— Ужо другі раз арганізуеш „Басовішча”. Год таму ўсе згодна сказалі, што ўрэшце фестываль адбіўся ад дна. Які Твой рэцэпт на дасягненне прагрэсу?

— Я не думаю, што наступіў аж так вялікі прагрэс. Цешаць мяне станоўчыя ацэнкі. Зараз галоўнае пытанне: ці нам камерцыялізаваць „Басовішча”, ці ўсё ж такі надалей застацца пры апазіцыі да таго, што зараз чуем паўсюдна побач сябе. Гэта дазволіць нам абраць напрамак для чарговых „Басовішчаў”.

— Якая бліжэйшая будучыня ў фестывалю?

— Сёлетні фестываль будзе багаты на змены. Моцна працуем, каб павысіць яго музычны ўзровень. Конкурсная частка пакажа маладыя таленавітыя гурты. Трэба сказаць, што прыязджаючыя з-за мяжы зоркі здаўна затрымаліся на сваім узроўні і гэта адпавядае густам некаторых слухачоў, якія спецыяльна для іх прыязджаюць. Фестываль ужо ў гэтым годзе „пойдзе ўперад”.

— У якім сэнсе „пойдзе ўперад”?

— Трэба сказаць, што „расклад” застаецца падобным як дагэтуль. Зменай будзе тое, што конкурс маладых гуртоў адбудзецца ў суботу. Фестываль пачне „адкрытая сцэна”. Арганізуючы конкурс у суботу, мы вырашылі паказаць, што маладыя выступаюць не як дадатак да фестывалю, а толькі як адзінкі, якія акрэсліваюць характар і якасць „Басовішча”. Таму ўручэнне ўзнагарод адбудзецца ў самы важны момант фестывалю — у позніх начныя гадзіны ў суботу. Сёлета вырашылі мы паставіць на візуалізацыю — ля сцэны з’явіцца адзін вялікі экран, а можа два. У Гарадоцкім доме культуры будуць дэманстравацца фільмы. У планах прафесійны дыджэй.

— Хочаце стварыць фестываль беларускай моладзевай культуры, не толькі музыкі?

— Вельмі нам хочацца, каб так было. „Басовішча” гэта не толькі канцэрт і шкада, што ў мінулым так літаральна было. Сённяшнія магчымасці шырокія і трэба імі карыстацца.

— Не забывайма таксама і пра другое жыццё фестывалю, гэтае па-за сцэнай...

— Вядома! Гэтае жыццё існавала і будзе надалей функцыянаваць. Адна дзяўчына мне сказала, што на „Басовішчы” музыка не да канца яе цікавіць, толькі назіранне за людзьмі. Яна штогод бачыць тыя самыя твары, што з’яўляецца доказам існавання групы верных мерапрыемству аматараў. Бачыла я таксама фільм Януша Гаўрылюка, на якім людзі гавораць, што прыязджаюць тут дзеля сустрэчы з людзьмі, з якімі раней пазнаёміліся на „Басовішчы”.

„Адкрытая сцэна” не абазначае, што выступіць зможа кожны, без якой-колечы селекцыі. Многа гуртоў не ў змозе выступаць на „Басовішчы” па розных прычынах: не гэты музычны жанр, мова небеларуская. Дастаткова, што гурт заявіць ахвоту выступіць і прадставіць нам сваю творчасць, а мы яму знойдзем месца...

Фота МІХАЛА КОСЦЯ

— Год таму вы здымалі фільм для архіва БАСу. Ці не думаеце зрабіць фільм пра „Басовішча” адрасаваны шырэйшай публіцы?

— „Басовішча” можна пабачыць на фільме „18”. Думаю гэты фільм паказаць сёлета, каб людзі маглі сябе пабачыць. Буду таксама вельмі рашуча гаварыць з Фондам маладога кіно, каб паспрабавалі зняць юбілейнае „Басовішча”. Важнай для нас з’яўляецца ідэя прэзентацыі архівальных відэазапісаў, якія мы сабралі і ператварылі ў лічбавы фармат.

— Афіцыйны назоў — Фестываль музыкі Маладой Беларусі. „Басовішча” зараз рокавае. Ці не думаеш, што маладыя сёння ўжо не слухаюць рок-музыкі?

— Калі фестываль паўставаў, прэзентаваліся на ім розныя музычныя жанры. Была бардаўская песня, была аўтарская. Рок-музыка таксама была, напрыклад, „Уліс” — сапраўдны рок-гурт. Цяпер маладыя слухаюць гіп-гоп. На „Басовішчы” заўсёды прысутнічала рок-музыка і так павінна застацца. „Басовішча” даказвае, што сёння можна іграць рок з вялікай заангажаванасцю і многае дасягнуць. Прыклад — конкурсныя гурты. Сумна, што сёлета не заявілі ахвоты выступаць на конкурснай сцэне гурты з Падляшша. Заяву даслаў толькі гурт з Варшавы, вакалісткай якога выступае беларуска. Шкада, што ўсё ж такі „нашы” папсаваліся. Калісь у „Басовішчы” маладыя гурты бачылі нейкі шанц, што знойдзецца ім месца.

— Год таму Ты абяцала на юбілейным XV фестывалі сюрпрызы...

— Галоўнай неспадзеўкай няхай будзе факт адсутнасці польскага гурту-зоркі. Думаю, што фестываль абароніцца без дарагіх польскіх калектываў. Сёлета з польскага боку прэзентуем музычнае Падляшша. Завершаць фестываль у вельмі кліматны спосаб гурт „Judy-4” ды вясёлы беластоцкі гурт „Hope On”.


Фота МІХАЛА КОСЦЯ

— Сёлета ўводзіце „адкрытую сцэну”. Што гэта?

— „Адкрытая сцэна” не абазначае, што выступіць зможа кожны, без якой-колечы селекцыі. Многа гуртоў не ў змозе выступаць на „Басовішчы” па розных прычынах: не гэты музычны жанр, мова небеларуская. Дастаткова, што гурт заявіць ахвоту выступіць і прадставіць нам сваю творчасць, а мы яму знойдзем месца на сцэне. На свабоднай сцэне чакаем гуртоў з Польшчы і Беларусі. Свабодная сцэна гэта таксама новы спосаб адкрыцця фестывалю і ўвядзення публікі ў „шаленства”.

— Дагэтуль „Басовішча” завяршалася роўна ў 2 або 3 гадзіны пасля поўначы. Сёлета таксама плануецца такое вострае выцішэнне?

— Не. Будзем выцішаць памалу, пры дапамозе прафесійных дыджэяў (можа з Беларусі) у пятніцу і гурту „Judy-4” у суботу.

— Сёлета будзе таксама традыцыйны конкурс. За якія ўзнагароды будуць змагацца гурты?

— Напэўна будуць гэта падобныя ўзнагароды як дагэтуль, хаця спісак узнагарод яшчэ не закончаны. Плануем таксама зрабіць іерархію ўзнагарод. Уводзім гран-пры — галоўную першую ўзнагароду.

— Усе шукаюць у „Басовішчы” палітычнага аспекту супраціву беларускім уладам. Як Ты ставішся да гэтага пытання?

— Праўду кажучы я тут выступаю як рамеснік гэтага фестывалю. Не вельмі мне хочацца будаваць ідэалагічныя аспекты. Вядома, што некаторыя гурты прыязджаюць, каб палітычна выказацца. І трэба заўважыць, што ахвота гуртоў дэманстраваць свае палітычныя думкі напэўна не прападзе. Тут ніякіх забарон і наказаў няма.

— Дзякуй за размову, жадаю добрага надвор’я!

— Дзякую.

Больш талерантнасці

20 чэрвеня адзначаўся Дзень бежанца. У Польшчы, каб атрымаць статус бежанца неабходна даказаць, што чужаземец уцякае перад палітычнымі рэпрэсіямі, рэлігійным праследаваннем. Найбольш уцекачоў трапляе з Афганістана, Пакістана, Чачні, Ірака, дзе працягваецца вайна, людзі паміраюць ад голаду, застаюцца без даху над галавой. Але эмігранты трапляюцца з іншых краін, напрыклад, з Беларусі, дзе не шануюцца чалавечыя правы. Для іх Польшча здаецца быць бяспечнай краінай у Еўропе, дзе можна абяспечыцца працай і спакойна жыць. Афармленне дакументаў палітычнага бежанца даволі складанае і працягваецца каля двух гадоў. У гэтай справе дапамагае Таварыства „Jeden świat".

А як мы ставімся да эмігрантаў? Цяжкія бытавыя ўмовы схіляюць да таго, што чужаземцаў лічым нахабнікамі, няпрошанымі гасцямі, якія абмяжоўваюць беспрацоўным шанц на працу, а бяздомным знайсці дах над галавой. Па-мойму, такая ацэнка несправядлівая ды неабгрунтаваная. Чужаземец не пакідае айчыну па сваёй волі, але па волі лёсу. Не выбірае працу на чужыне ды прымае тое, што доля падкіне. А з нашымі беспрацоўнымі ўсяляк бывае. Выснова з гэтага адна. Не хапае нам талерантнасці, напрыклад, у адносінах да ромаў. Палякі звыклі гаварыць: „цыган — гультай і злодзей". А мне здаецца, што гэта народ з багатай культурай ды традыцыяй. Толькі лёс для іх непрыхільным стаў, яны вымушаны былі бадзяцца па свеце табарамі ў пошуках лепшай долі, як палякі ў дваццатыя гады шукалі „абяцанай зямлі". Ці тады жыхары Амерыкі лічылі іх нахабнікамі і няпрошанымі гасцямі?

Уладзімір Сідарук

Эканамічны форум „Польшча-Усход"

17 чэрвеня ў Цехацінку Куяўска-Паморскага ваяводства адбыўся эканамічны форум „Польшча-Усход: напрамкі эканамічнага супрацоўніцтва паміж Польшчай і Беларуссю, Казахстанам, Малдовай, Расіяй, Украінай". У сустрэчы з бізнесменамі Куяўска-Паморскага ваяводства прынялі ўдзел прадстаўнікі гандлёва-эканамічных службаў пасольстваў Беларусі, Казахстана, Малдовы, Расіі, Украіны ў Польшчы.

У выступленні перад удзельнікамі сустрэчы і ў інтэрв'ю ваяводскаму бізнес-часопісу „Рэгіён" прадстаўнік Пасольства Беларусі праінфармаваў аб актуальнай эканамічнай сітуацыі на Беларусі, магчымасцях і ўмовах супрацоўніцтва з польскімі партнёрамі. Падчас форуму з шэрагам польскіх бізнесменаў былі абмеркаваны канкрэтныя праекты па наладжванні эканамічнага ўзаемадзеяння з беларускімі прадпрымальнікамі.

Прэс-служба Пасольства РБ

Прэзідэнціха ў Беластоку

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Першы раз у Беластоку пабывала першая дама Рэчы Паспалітай, жонка прэзідэнта Іаланта Кваснеўская. Пусціла ў рух новае абсталяванне для радыетэрапіі ў анкалагічнай бальніцы, наведала дзяцей з паталагічных сем'яў у Згуртаванні „Наш дом", прыняла ўдзел у агульнапольскім з'ездзе асоб жывучых са СНІДам (былі і госці з Беларусі) і ў канферэнцыі прысвечанай вырашанню праблем у паталагічных сем'ях.

Усміхаючаяся з грацыяй жонка прэзідэнта, у знакаміта пашытай белай крэацыі з вялікімі чорнымі гузікамі, ды не адно не выключна з гэтай прычыны выклікала захапленне падчас двухдзённага візіту. Са зразуменнем сустрэўся яе заклік, выказаны ў час канфернцыі аб неабходнасці ахаплення асаблівай апекай моладзі, каб асцерагчы яе ад наркотыкаў, якія распаўсюджваюцца нават у вясковых асяроддзях.

— Наркаманіі ў ніякай краіне, незалежна ад узроўню заможнасці, не ўдалося пазбегчы, — гаварыла. — Нясе яна за сабою таксама грамадскія адмоўныя вынікі, сярод іх — грамадскую маргіналізацыю.

Заклікала:

— Калі б мы больш размаўлялі з дзецьмі, не сягалі б яны да такіх альтэрнатыўных развязак, як наркаманія.

Далей пераконвала, што праблема залежнасці не кранае аднаго наркамана ці алкаголіка, а дапамога патрэбная ўсёй сям'і. І далей:

— У сям'і павінна фармавацца грамадская адказнасць, якая выключае залежнасці.

У дзень канферэнцыі і візіту Іаланты Кваснеўскай у Беластоку якраз выпаў Дзень бацькі. Таму ў сваім выступленні спасылалася яна на гэтае свята:

— Гэта вы, бацькі, павінны праводзіць „мужчынскія размовы", але, калі трэба, таксама і прытуліць. Ніякая ўстанова не заменіць сям'і, якая мусіць стацца апорай. І гэтую каштоўнасць можам унесці ў супольную Еўропу.

Іаланта Кваснеўская засела таксама ў г.зв. Савеце мудрацоў, дарадчым органе пры старшыні ААН Кофі Анане. Займаецца там м.інш. пытаннямі наркаманіі сярод маладых людзей. Да яе заданняў належыць пераконванне ўсходніх суседзяў Польшчы да неабходнасці яе вырашэння. Праводзіла ўжо такія размовы з жонкамі прэзідэнтаў Украіны і Расіі. На жаль, у сувязі з ахалоджаннем адносін з Беларуссю, да такіх размоў не дайшло з жонкай прэзідэнта Беларусі.

Мацей Халадоўскі

У Гайнаўскім павеце турысты могуць наведаць шмат цікавых месц, шмат чым захапляцца

Краіна адкрытых аканіц

Атракцыён Гайнаўскага павета гэта не толькі прыгажосць прыроды Белавежскай пушчы. Апрача векавых дубоў, зуброў ды рэдкіх відаў раслін, звяроў і птушак можна тут убачыць шматлікія помнікі старадаўнасці. Зацікаўленне турыстаў выклікаюць маляўніча распаложаныя вёскі з прыдарожнымі каплічкамі, цэрквы, скансэны беларускай народнай культуры. Драўляная архітэктура гэтага рэгіёна своеасаблівая.

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Хата Анны Туроўскай у Сацах

Падчас вандровак па Гайнаўшчыне варта наведаць Паляўнічы дом 1845 года ў Белавежы, у якім цяпер знаходзіцца Асяродак прыродазнаўчай адукацыі Белавежскага нацыянальнага парку. Ён з'яўляецца найстарэйшым будынкам у Белавежы. Пабудавалі яго намесніку Паўночна-заходняга краю Рускай імперыі. У 1860 годзе ўпершыню ў Белавежскую пушчу прыехаў на паляванне цар Аляксандр II. Паляўнічы дом разбудавалі і ўпрыгожылі дэкаратыўнымі элементамі. Затрымліваліся ў ім на начлег рускія князі.

Зараз турысты могуць глядзець гэты прыгожы драўляны будынак, і ў сярэдзіне яго фатаграфічныя і пластычныя выстаўкі. Навокал знаходзіцца Палацавы парк, а ў ім ставы з колішніх старарэчышчаў Нараўкі і абеліск з пясчаніку ў гонар аднаго з выдатных паляванняў. У парку расце каля 90 відаў дрэў і кустарнікаў, у тым ліку 60 замежнага паходжання.

У Белавежы па вул. Застава заснавалі скансэн. У ім знаходзяцца ветраныя млыны, хаціна 1892 года, гумно, свіран-клець, пасека. У будынках размешчаны традыцыйныя прылады і прадметы, якімі карысталіся некалі ў вясковых сядзібах.

Народную архітэктуру можна пабачыць у Трасцянцы, Пухлах і Сацах (Нарваўская гміна), у Чыжах і Кленіках (Чыжоўская гміна) ды ў Масеве (Нараўчанская гміна). Маюць яны багатую арнаментоўку на навугольніках, падстрэшніках і вятроўках, а таксама ажурныя кампазіцыі над вокнамі. Захаваліся яшчэ там-сям студні з жураўлём.

Прыгожы драўляны памешчыцкі дом 1901 года стаіць каля Старыны ў Дубіцкай гміне. Вакол яго растуць старыя бярозы і ліпы. У маі каля трох ганкаў цвіце бэз.

Варта пабачыць Свята-Троіцкі сабор у Гайнаўцы, прыгожыя цэрквы м.інш. у Белавежы, Дубінах, Дубічах-Царкоўных, Трасцянцы, Ласінцы, Нараўцы і Семяноўцы. Варта наведаць урочышча Крыначка каля Гайнаўкі з царквой 1848 года ды каплічкай над цудоўнай крыніцай. Штогод прыбывае сюды многа паломнікаў.

У Гайнаўскім павеце больш за 450 помнікаў старадаўнасці. Немагчыма іх пералічыць. Трэба папросту сюды прыехаць...

Янка Целушэцкі

Развіталіся на канікулы

Выпускнікі Гайнаўскай беларускай гімназіі разам са сваімі малодшымі сябрамі і ліцэістамі развіталіся са школай 25 чэрвеня ў час урачыстых лінеек. На мерапрыемствах прысутны былі настаўнікі і бацькі. Выдатнікі па вучобе атрымалі з рук дырэктара Яўгена Сачко пасведчанні з чырвонай паласой і кніжныя ўзнагароды. Пераможцы спартыўных спаборніцтваў былі ўзнагароджаны дыпломамі.

— Нельга дабіцца поспехаў у вучобе без работы. Каб мець выдатныя ацэнкі трэба быць здольным і многа працаваць, — заявіў дырэктар Яўген Сачко. Гаварыў ён пра добрыя вынікі белгімназіі і белліцэя ў рэйтынгах арганізаваных газетамі.

Большасць белгімназістаў трэціх класаў развіталася толькі на канікулы. За выключэннем трох вучняў, усе выпускнікі збіраюцца паступаць у белліцэй.

— Зжыліся мы з вучнямі па класе, настаўнікамі і таму не хочацца пакідаць школу, — кажуць белгімназісты. Яны задаволены, што мелі магчымасць ездзіць на экскурсіі і паломніцтвы. Многія гімназісты адпачывалі на моры, у горах і наведалі амаль усе праваслаўныя манастыры ў Польшчы.

— Мы добра адчувалі сябе ў гімназіі. У школе была прыемная атмасфера і прыхільныя да нас настаўнікі. Заняткаў было многа, але былі яны цікавыя і таму мы ахвотна вучыліся, — прызналася Маргарыта Кулік.

— У школе высокі ўзровень навучання і гэта дае нам вялікія магчымасці здабыць добрую адукацыю ў будучыні, — гаворыць Наталля Скепка. Ейная сяброўка Ева Панасюк дабаўляе, што паступаць у белгімназію раілі старэйшыя вучні, якія раней яе закончылі.

У белгімназіі вучні мелі магчымасць займацца ў час пазаўрочных заняткаў. Многія гімназісты трэціх класаў займаліся ў школьным музычным калектыве. Толькі ў апошнім школьным годзе яны занялі першыя месцы ў Конкурсе беларускай песні ў Бельску-Падляшскім і Аглядзе праваслаўных калядак у Гайнаўцы. Выдатнікамі па вучобе сярод выпускнікоў сталі Наталля Скепка, Марта Кузьма, Анна Сянкевіч і Магдаліна Андраюк з III „а" класа, Норберт Васілюк, Магдаліна Чыквін, Наталля Шэршуновіч, Андрэй Грыгарук і Павел Келбашэўскі з III „б" класа. У гэтым класе ажно ў 21 асобы атрымаліся сярэднія ацэнкі па вучобе 4,0 або вышэйшыя. Да поспехаў школы ў рэйтынгах спрычыніліся пераможцы прадметных конкурсаў. Фіналістамі Конкурсу беларускай мовы былі Наталля Тарасевіч, Дарота Куптэль і Андрэй Грыгарук, польскай мовы — Магдаліна Чыквін і матэматыкі — Магдаліна Анікіюк. Амелія Горбач многа разоў перамагала, як салістка, у конкурсах песні.

Белгімназісты многа займаліся ў спартыўных гуртках. Хлопцы занялі II месца ў Павятовых спаборніцтвах па валейболе і апынуліся ў ліку дзесяці найлепшых каманд Спабоніцтваў па валейболе за кубак Падляшскага ваяводства. Дзяўчаты занялі II месца ў Павятовых спаборніцтвах па баскетболе і III месца ў Агульнапольскім турніры праваслаўнай моладзі па баскетболе. Марыюш Панькоўскі атрымаў у гімназіі званне найлепшага валейбаліста, а другое месца заняў яго сябра Караль Васілюк.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Выдатнікам III „а" класа кніжныя ўзнагароды ўручыў дырэктар Яўген Сачко

Многа выпускнікоў займалася валанцёрствам.

— Памагаючы старэйшым асобам мы зразумелі, што нельга праходзіць збоку, калі бачым крыўду іншых. Мы радаваліся, што можам дапамагаць, — заявілі Наталля Скепка і Маргарыта Кулік, якія разам з класнымі сяброўкамі хадзілі памагаць у Дом міласэрнасці „Самаранін".

— Займаючыся ў іканапісным гуртку мелі мы нагоду вучыцца пісаць іконы і малявалі. Падабаліся нам беларускія турніры, у якіх мы выступалі. Можна было там спраўдзіць веды па беларускай мове і спартыўныя магчымасці, — дабаўляе гімназістка. — Цікавыя заняткі і сустрэчы былі арганізаваныя ў рамках біялагічнага гуртка.

— Цікава пра гісторыю Беларусі расказвала нам настаўніца беларускай мовы Іаланта Грыгарук. Аднак найбольш любілі мы чытаць апавяданні. Цікавымі былі паездкі ў Беларусь, дзе мы пазнаёміліся з новымі людзьмі і беларускай культурай, — кажа Маргарыта Кулік. — Настаўнікі арганізавалі нам таксама экскурсіі ў беларускі музей.

— Нашы настаўніцы па беларускай мове Вольга Сянкевіч і Іаланта Грыгарук умеюць зацікавіць сваім прадметам і таму мы ахвотна вучыліся па-беларуску, — гавораць дзяўчаты.

— Беларуская мова — мова нашых продкаў і мы павінны яе ведаць. Можна будзе выкарыстаць яе ў час паездак у Беларусь, — сказала Маргарыта Кулік. — Са сваімі бабулямі і дзядулямі я заўсёды гавару на дыялектнай беларускай мове.

— Заўважыла я сярод гімназістаў зацікаўленне беларускай мовай. Хаця ўсе вучні ў падставовай школе вучыліся беларускай мове, то яе веданне было рознае і трэба было падраўняць узровень умеласцей гімназістаў. У час урокаў я больш увагі адводзіла на ўмеласці вучняў. Звяртала ўвагу на элементы гісторыі Беларусі і аналізавалі мы эміграцыйную літаратуру. Чыталі артыкулы з „Нівы", а некаторыя вучні дасылалі ў рэдакцыю свае тэксты. Гімназістам прыемна было бачыць свае артыкулы ў газеце, — інфармуе настаўніца Іаланта Грыгарук.

Пасля супольнай сустрэчы вучні разышліся на спатканні з выхавацелямі і атрымалі там пасведчанні. Даўжэйшымі былі сустрэчы з выпускнікамі белгімназіі. Развітваючыся са сваімі настаўнікамі дорылі яны прыгожыя кветкі і дзякавалі за выхаванне і адукацыю.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вялікіх поспехаў па вучобе дабілася многа выпускнікоў III „б" класа

У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы вучылася 177 гімназістаў і 235 ліцэістаў (апрача выпускнікоў белліцэя, якія адышлі раней). Ажно ў 62% белгімназістаў і 48% белліцэістаў атрымаліся сярэднія ацэнкі па вучобе 4,0 або вышэйшыя. Самых лепшых вынікаў па вучобе дабіліся вучні II „а" класа белгімназіі і II „б" белліцэя.

Сімпатык „Чарамшыны"

Яцэк Курань, будучы старшынёю Сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей, сутыкнуўся з калектывам „Чарамшына" і з таго моманту стаў сімпатыкам гурту. Памятаю Ягоны візіт у Чаромсе на „Фолькавых сустрэчах", на якіх гасцяваў па запрашэнні „Чарамшыны". Такі сам, якога бачыў я ў тэлебачанні: у джынсавай куртцы ды расшпіленай кашулі. Сядзелі мы побач на пляцоўцы каля дома культуры.

У постсалідарніцкіх групоўках захоўваецца традыцыя героям ставіць помнікі. Ці пабудуюць Яцку Кураню — цяжка сказаць. Незалежна ад таго Ягоная ідэя застанецца жывая ў пушчанскай вёсцы Тэраміскі, дзе працуе заснаваны Ім усеагульны універсітэт, сярод удзельнікаў „Чарамшыны" і многіх беспрацоўных, якія карыстаюцца сацыяльнай дапамогай званай „куранёўкай". **(ус)**

Сыты галоднаму не спагадае

Аб тым, што чыноўнікі Міністэрства здароўя і сацыяльнай дапамогі неакуратна ставяцца да праблем няпоўнаспраўных і ўскладняюць жыццё інвалідам, лепш не гаварыць. Інваліду законна належацца артапедычныя рэчы для рэабілітацыі. Частку сумы пры закупцы кампенсуе фонд здароўя. Я карыстаюся артапедычнымі ботамі. Заказваў такія ў майстэрні ў Беластоку. Даўней адно даваў я заяву, пасведчаную лекарам- спецыялістам, бралі меру і праз некалькі тыдняў боты былі зробленыя. Пасля патрабавалі лекарскі дакумент пасведчаны спецыялістам-артапедам завяраць у Нацыянальным фондзе здароўя. У гэтай установе мне заявілі, што на пасведчанне майго дакумента трэба склікаць асобую камісію, якая разгледзіць справу на працягу... трох-чатырох тыдняў. Затым пашлюць пасведчаны дакумент дамоў, а тады можна будзе мне ехаць у майстэрню заказваць боты. Столькі валакіты, кашмар! Нікога не хвалюе, што чалавеку з хворымі нагамі цяжка хадзіць, а яшчэ цяжэй падымацца па лесвіцы. Чыноўнікаў НФЗ справа не тычыцца. Нездарма ў народзе кажуць: „Сыты галоднаму не спагадае". Святая праўда! **(ус)**

Прадстаўнік вёскі

Міхалоўская гміна (Беластоцкі павет) налічвае трыццаць пяць салэцтваў. Абавязкі солтыса выконвае адзінаццаць жанчын: у Баршчэве, Бандарах, Ціванюках, Цісоўцы, Ялоўцы, Міхалове, Пяньках, Саколі, Тапалянах, Тыльвіцы і Залешанах.

Шматгадовымі солтысамі з'яўляюцца м.інш. Ян Бойка з Лявонавіч, Яраслаў Касацкі з Юшкавага Груда, Барбара Грыц з Ціванюкоў і Ніна Лукша з Бандароў. Упершыню гэтую функцыю выконваюць м.інш. Антаніна Старая з Баршчэва, Рышард Андрушкевіч з Адногі і Люба Аксюцік з Пянькоў. **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ужо ў трэцім класе! З дзеткамі настаўніца Аліна Ваўранюк

Вершы Віктара Шведа

Пустая галава

— Чаму, — спытаў Адам Івана, —
Калі на галаве я стану —
Упасці ўжо тады гатоў,
У галаву плыве з ног кроў?

Калі я стану зноў на ногі —
Не дзеецца тады нічога.
— Таму сенсацыі такія, —
Бо твае ногі не пустыя.

Малітва

Атрымаў ад сябра Вацік
Раптам пытанне такое:
— Ці гаворыце вы ў хаце
Малітву перад ядою?

— Мы молімся толькі выпадкам,
Калі суп есці прыйшлося
З грыбоў невядомых, што татка
Часам нам з лесу прыносіць.

Буду слухаць як шуміць мора!

Як правяду летнія канікулы? Пра свае планы, напярэдадні канікул, распавялі нам сябры з беластоцкай „чацвёркі”.

Юліта Нікалаюк: Паеду да бабулі Анны ў Плютычы. Там буду гуляць з сябрамі. Разам з мамай паедзем на рэчку паплаваць. А з бабуляй пагуляем у карты. Будзе весела і гэтыя канікулы будуць найлепшымі.

Ігар Карнілюк: Буду сустракацца з прыяцелямі і гуляць у мяч. Запрашу майго дваюраднага брата і разам сядзем ля камп'ютэра пагуляць у гульні. А на шпацыр па лесе забяру сабак, яны будуць бегаць, а я буду збіраць суніцы, чарніцы, маліны, грыбы, ажыну, брушніцы.

Лідка Пякарская: Разам з сяброўкай Нінай паедзем у Пагажэлец. Як будзе цёплае надвор'е — пойдзем купацца або ездзіць на веласіпедах. Напэўна паеду да бабулі Ніны. Калі буду ў хаце, дык сустрэнуся з сяброўкай Патрыцыяй. Можа паеду ў Чэхію? Яшчэ хацела б паехаць у Італію.

Матэвуш Куклік: Паеду на лагер каратэ, а пасля да бабулі Гені. Там буду гуляць з сябрамі і купацца ў рэчцы.

Міхася Дамброўская: На пачатку канікул я паеду на мора. Раніцай буду збіраць ракавінкі і янтар, буду прыслухоўвацца, як шуміць мора.

Пасля, разам з мамай, паедзем у горы. Буду там спаць, есці ў гасцініцы сыркі асцыпкі і падымацца на высокія горы. Апошнія дні канілул правяду на ўчастку, буду купацца і паліваць кветкі.

Ніна Ваўранюк: Я паеду ў Пагажэлец. Гэта малая вёска на Сувальшчыне. Там вялікае возера і я буду ў ім купацца. Калі вярнуся дахаты, запрашу дваюрадную сястру з якой будзем гуляць у кубікі. Паедзем да бабулі Мані, у яе ёсць маленькі коцік. Пасля да бабулі Раі, у якой сабачка Рыжык, з якім я буду хадзіць на шпацыр. Калі вярнуся дахаты, буду гуляць з сяброўкамі. У мяне вельмі многа сяброўак: Агнешка, Паўля, Каміля, Моніка, Мартына, Оля, Эвеліна, Вераніка і Габрыся.

Я хацела б паехаць у Беларусь. Калі я там была ўпершыню, мая сяброўка Лідка зрабіла мне здымак з Ленінам. Вельмі мне там падабалася. Думаю, што канікулы будуць вясёлыя.

Зорка

Белавежскія быліцы і небыліцы

Найпрыгажэйшыя

Калісьці ў адным пушчанскім урочышчы па-суседску жылі сава ды куніца. У згодзе ды прыязні вялікай увесь час хадзілі. Вядома ж — і адна, і другая цёмнай ноччу палююць, а ўдзень у дуплах, у сваіх гнёздах сядзяць.

Аднойчы, на змярканні, сустрэліся яны на ўзлеску. Сава ў поле ляцела мышэй лавіць, а куніца ў пушчанскую чашчобу за спажываю збіралася.

Тут яны і разгаварыліся.

— Вы, кума, куды сабраліся? — пытаецца сава ў куніцы.

— У пушчу іду, кумачка, прагаладалася я нешта. Вечар ужо настае, а ў жываце пабурквае. Можа, дзе вавёрку сонную прыдбаю на вячэру, або на гняздзечка з птушанятамі натраплю.

— Ах, кума, — пачала сава прасіць куніцу. — Вы толькі маіх дзетак хоць не чапайце!..

— Ды што вы! Нават і пальцам не крану, — запэўніла яе куніца. — Але як жа ж мне іх пазнаць?

— Ну, што вы?! — абурылася сава. — Маіх дзетак ды і не пазнаць!.. Яны ж наймілейшыя і найпрыгажэйшыя на свеце!

— Ну, калі так, дык напэўна пазнаю іх і з іншымі не зблытаю, — супакоіла суседку куніца.

На гэтым яны і разышліся кожная ў свой бок: сава на поле паляцела, а куніца ў глыб пушчы падалася.

Вандравала куніца па пушчы, з дрэва на дрэва пераскокваючы, аж на гняздо на старой яліне наткнулася. Зазірнула ў яго — там такія прыгожыя птушаняткі ў дупле сядзяць, глядзі — не нагледзішся. „Пэўна, гэта дзеці савы, — падумала яна, — не буду іх чапаць”, — і пайшла далей. На разгалістай ліпе ў дупле зноў гняздо вынюхала. У ім птушаняты такія сабе — не надта прыгожыя і не цалкам брыдкія. „Ат, — памеркавала куніца, — няхай жывуць, мо яны савіныя дзеці”. У дупле старога каржакаватага дуба таксама гняздо знайшла. Працінулася туды праз дзірку і бачыць, што там птушаняты сядзяць надта ж брыдкія: з шырокімі ратамі, нерухавыя, аблезлыя нейкія. Куніца ўзяла іх ды паела. З перапоўненым жыватом ледзь выкараскалася з дупла, задаволена аблізалася і ўжо ў сваё гняздо ісці намервалася. Ажно тут наляцела аднекуль сава, за-

Старая студня

У старой студні жыве неба. Ды не такое, блакітнае, што нахіляецца над тваёй галавой, калі ты зазіраеш у яе прахалоднае нутро. У студні, нават і ўдзень, сядзіць месяц, а сонца ў спёку, стомленае, запускае свой доўгі прамень, каб ахаладзіцца. Па абымшэлых кругах, упушчаных у зямлю, заломваецца і гіне сонечнае праменне, аксамітна коціцца голас, калі гукнуць у сярэдзіну студні. І быццам бы не ты пытаўся ў студні, а яна адказвала не табе. Быццам яна адгукаецца на пытанне, якое прагучала шмат гадоў таму, калі ў яе, маладую, з чыстым зрубам, з усё наплываючаю крынічнай вадой, заглядалі твае, малыя тады, прабабка ці прадзедка, дзед ці бабуля, і глядзелі ў той таемны свет. Далёкі і страшнаваты. Але і блізкі, як блішчастая паверхня вады, куды можна ўпасці і захлынуцца. Накрыты дашком, каб не нападала туды лісце, парушынне ды насякомыя, пад які нельга дзецям заглядаць. Пераказваюцца страшныя гісторыі, як чыйсьці хлопчык перахіліўся цераз зруб... Як свавольнае кацяня, што гуляла на краі, звалілася ў ваду ды ўтапілася...

Са старой студні п'е толькі конь Лысы. Можна сказаць, пенсіянер. Бо ў полі робіць за яго трактар. І за студню працуе водаправод. Але Лысы і не думае піць ваду з трубаў, хоць і смачная, мабыць, для кароў, курэй ды свіней, а і з людзей ніхто не набірае адсюль вады, каб напіцца яе, крычнічнай, сцюдзёнай, бляшаным кубачкам, што вісіць на цвічку на плоце. Раней шмат хто з акалічных вёсак, едучы на далёкія лугі, заязджаў на гэты падворак, набраць вады. Слаўная была вада на ўсю аколіцу! І далей б'е тая крыніца, праз дно студні знізу прасочваецца вада. Дзед Іван, дзеля парадку і чысціні, выбірае тую ваду са студні, каб паліць агарод і даць месца новай. Але Лысы ведае — гэта якраз з-за яго, што ён, толькі ён, піць хоча тую ваду, дзьмухнуўшы спачатку з храпаў на паверхню вядра, дзе яна, вада, аж зморшчыцца, толькі ён набірае ў свае мяккія конскія вусны таямніцы з нетраў зямлі, дзякуючы ўсяму гэтаму — тая студня жыве.

Стаіць студня ў амаль абезлюдзелай вёсцы. Прыходзяць да яе дзед Іван, праўнучка Еўка і праўнук Кандрат ды стары Лысы, конь.

Міра Лукша

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Танцуюць „Лялечкі" з Абухава (Беларусь)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Матэвуш Магрук — дэкламатар з Бельска

Твар

Калі глядзім у даль
І адышлі мы з дому,
Бачым чыйся твар,
Можа мамін, а, можа, братаў.

Калі пройдзем хоць малы крок,
Ужо не бачым нічыйго твару.
Слёзы нам коцяцца з вачэй,
Бо так хочам бачыць каханы твар.

Вясна

Прыйшла вясна,
радасная, гарачая,
закруціла ўсім у галовах,
вучняў меншае на ўроках,
нікому не хочацца вучыцца,
усе гуляюць
і Амурка зачапаюць.

Наталля Вярбіцкая, Гімназія ў Нараўцы

Час рыцараў

Імёны і магія

У сярэднявеччы людзі жылі намнога карацей як зараз. Многа гінула ў час ваенных паходаў або ад голаду. Пяцідзесяцігадовы чалавек уяўляўся як старэча. Ды і нямногія дажывалі такога ўзросту. Жанчыны паміралі раней за мужчын, часта пасля першых родаў у 16-18 гадоў. Яшчэ часцей паміралі дзеці. Кожны чацвёрты малеча не дажываў шасці гадоў.

Наогул тадышнія людзі былі нізкімі. Веліканам, напрыклад, лічыўся польскі кароль Казімір Вялікі, які меў усяго 184 сантыметры росту! Ён, як адзначаюць летапісцы, перавышаў сваіх дружыннікаў на голаў.

А якія імёны выбіралі сабе людзі? Дзеці мелі імёны па сваіх дзядах і прадзедах. Каб адрозніць паасобных членаў сям'і, дзецям прыдумоўвалі мянушкі. Дзеля гэтага дадавалі назоў мясцовасці, напрыклад: Еўфрасіння Полацкая, Марцін Бельскі ці Кміта Чарнобыльскі.

Апрача хрысціянскіх імён вялікай славай карысталіся славянскія, зразумелыя сваім значэннем. Згаданая Еўфрасіння пакуль не пастрыглася ў манастыр, у міры называлася Прадслава.

Сёння таксама сустракаем старажытнаславянскія імёны як: Барыслаў, Вячаслаў, Дабраслава, Людміла. Праўда, мала хто з сучасных задумоўваецца над значэннем свайго імя. Нават славянскія імёны, на першы погляд, многім незразумелыя.

У часы рыцараў імя дзейнічала як магічная метрыка. Яно мела прыдаваць характар асобе. Вось імя Дабраслава мела засцерагаць уласніцы поспех і паважанне, значыць *добрую славу*. Сярэдневечныя людзі, каб не страціць падараванай ім у час хрэсьбін моцы, баяліся ўголас вымаўляць сваё сапраўднае імя.

(працяг будзе)

Зорка

Польска-беларуская крыжаванка № 27

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 24: Душ, мак, рагоз, узгорак, дар. Мурза, крок, год мора, базар.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Рыгор Казлоўскі** з Міклашоў і **Эвеліна Бура** з Беластока. Віншуем!

зірнула ў дупло, енкнула з гора і накінулася на куніцу:

— Ах ты, паганая зладзейка, разбойніца ты крыважэрная! — І з вострай дзюбай ды расшчаперанымі кіпцюрамі на куніцу напала. — Навошта ты маіх дзяцей паела, гадаўка?..

— Што ты, кумачка, не можа быць! — пачала тая апраўдвацца. — Вы ж казалі, што вашыя дзеткі наймілейшыя і найпрыгажэйшыя на свеце. Гэтыя ж, што я тут напаткала, былі такія непрыгожыя, такія агідныя...

— І наймілейшыя, і найпрыгажэйшыя, каб ты тое ведала! — раскрычалася сава. — Вось няхай толькі ты прывядзеш сваіх сляпых кацянят, паглядзіш, якія мілыя ды прыгожыя яны будуць табе. Але я не пагляджу на іхнюю брыдоту і ўсіх да аднаго праглыну! — сказала яна, мякка ўзмахнула крыламі і, паенкваючы ад болю матчынага сэрца, знікла ў цемры.

Куніца ўжо не рада была сваёй смакавітай вячэрай і, панурыўшы голаў, да свайго гнязда павалаклася.

З таго часу паміж савой і куніцай пайшла вечная вайна за дзяцей. Ваююць яны і па сённяшні дзень. Сярод людзей жа такая вось прыказка ходзіць: кожная пліска свой хвосцік хваліць, а кожная сава — сваіх дзетак.

У канцы мая ў „Слаўконіі” каля Скупава праходзіў мастацкі пленэр з удзелам гайнаўскіх і варшаўскіх мастакоў. Дадаткова прымалі ў ім удзел гімназісты з Нараўкі...

Жывапіс і фатаграфіі

У Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы нядаўна былі адкрыты выстаўкі жывапісу і фатаграфій. Жывапісцы паказваюць плён мастацкіх пленэраў у Дубічах-Царкоўных і каля Скупава. Фатографы прадстаўляюць здымкі прыроды Гайнаўшчыны і Сібіры. У калідоры музея на фатаграфіях увекавечаны сёлетнія сустрэчы моладзі з Беларусі і Гайнаўскага павета. На адкрыцці выставак, якое праходзіла 6 чэрвеня, выступілі фальклорныя калектывы „Ільінская пятніца” з Латвіі, „Кудзьмень” з Мінска і гурт „Ад Познані”, якія раней выступалі ў Музеі малой айчыны Дарафея Фіёніка ў Студзіводах.

У канцы мая ў „Слаўконіі” каля Скупава праходзіў мастацкі пленэр з удзелам гайнаўскіх і варшаўскіх мастакоў. Дадаткова прымалі ў ім удзел гімназісты з Нараўкі. Уласнікам маёнтка „Слаўконія” з'яўляецца Славамір Галёнка з Гайнаўкі, які цяпер жыве ў Варшаве. Месца пленэру знаходзілася сярод маладога лесу. Вучні выконвалі там раслінныя матывы ў гіпсе і малявалі краявіды.

— Я працаваў у пушчы. Пасля малявання хаваў работу ў лесе і прыязджаў да ўдзельнікаў пленэру, а на другі дзень вяртаўся ў пушчу і ізноў займаўся мастацтвам, — кажа гайнаўскі мастак Віктар Кабац, які маляваў елкі і сосны. Яго сябра Пётр Гаган маляваў старыя дрэвы.

Традыцыйныя краявіды і абстрактныя працы выканаў Алег Кабзар, які цяпер жыве ў Варшаве. Славамір Галёнка рабіў у гіпсе раслінныя матывы. У пленэры ўдзельнічалі Мікола Колас з Беларусі і Алена Колас з Украіны, якія паказалі ўсходнюю школу малявання. Найчасцей мастакі малявалі архітэктуру Скупава і лясныя краявіды. Віктар Кабац вучыў гімназістаў абстрактнаму маляванню. Вучні разлівалі фарбу на паперу і пасля з плямаў выводзілі канкрэтныя матывы і пасвойму завяршалі работы.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

На мастацкім пленэры каля Скупава (злева): Віктар Кабац, Наталля Кос, Пётр Гаган і Кася Ваўранюк

— Пленэр стварыў магчымасць маляваць карціны сярод натуры, — гаворыць Наталля Кос з Бельскага белліцэя, якая далучылася да гімназістаў з Нараўкі. Намалявала яна прыгожыя алейныя работы.

Мастацкі пленэр у Дубічах-Царкоўных адбываўся раней і прымалі ў ім удзел мастакі з Варшавы, Беларусі і Гайнаўшчыны. Малявалі яны краявіды Белавежскай пушчы і наваколля. Асабліва спадабаўся ім пралесак каля Махнатага, які паявіўся на некалькіх працах.

— Пленэр знаёміў з трыма жывапіснымі школамі мастакоў з Варшавы, Заходняй Беларусі і Гайнаўшчыны. Беларускія жывапісцы малявалі рэалістычныя краявіды і ў іх работах відаць яшчэ ўплыў савецкай жывапіснай школы. Аднак яны ўражлівыя і валодаюць добрай тэхнікай малявання. Мастакі з Польшчы паказалі добрую варшаўскую школу. Шукалі яны колераў у краявідах і шырока клалі фарбы.

У галерэі „Гайна”, што знаходзіцца ў музеі, у канцы мая была адкрыта выстаўка фатаграфій, якіх аўтары жывуць у Гайнаўцы. Можна там знайсці здымкі лясных дрэў Уладзіслава Завадскага, раслінных дэталяў Славаміра Куліка, цікавых краявідаў Тамаша Анікіюка і Анны Шэшка. Апошняя фатаграфавала Сібір і таму яе здымкі выклікалі вялікае зацікаўленне. Выпускнік Гайнаўскага белліцэя, студэнт фатаграфічнага аддзялення Фільмавай школы ў Лодзі Андрэй Мусько выканаў мастацкія чорна-белыя здымкі прыроды. Былы дырэктар Гайнаўскага белліцэя Васіль Дамброўскі і яго дачка Ева Дамброўская прынеслі на выстаўку фатаграфіі дэталяў пушчанскай расліннасці. Іншыя фатографы прадставілі старую архітэктуру і прыдарожныя крыжы, якіх многа на Гайнаўшчыне.

Аляксей Мароз

Далікатныя душы

У пачатку сямідзесятых геркаўскіх гадоў прыйшлося адведзены мне для жыццёвай вандроўкі час каратаць у адным з гарнізонных інтэрнатаў. Маім сужыльцом быў вайсковы лекар Збышак Вісьнёўскі. Пра яго асталіся ў мяне самыя лепшыя ўспаміны.

Пакідаючы збоку ўсялякія ваенныя тайны, асноўным стрыжнем вайсковых узаемаадносін — думаю, што не толькі ў доблесных арміях Варшаўскага дагавора — быў стол, а дакладней — тое, што на стале бывала. І стол у маім і Збышкавым пакоі быў хутчэй правілам, а не выключэннем; маю тут на думцы не толькі настольную матэрыю, але і лунаючы над ёй дух. А вайсковы стол той — здаецца мне далей — быў аднолькавы з класава роднаснымі сталамі так рабочага, як і сялянскага пралетарыяту. З першанапоямі, закускамі ды прагрэсуючай за імі духовай атмасферай.

Пераступіўшы нейкі парог згаданага прагрэсу мой добрапамятны сябра Збышак раскрыў перада мною свае творчыя даспехі — былі гэта ягоныя вершы на капыл рэвалюцыйнай паэзіі Уладзіслава Бранеўскага. Я, праўда, творчымі спробамі таксама калісь займаўся, але ў той час была ўжо гэта мая сівая мінуўшчына, нявартая сур'ёзнай згадкі. Аднак за каторымсьці з чарговых парогаў застолля я рассакрэціў Збышку, што з'яўляюся беларусам. Мой таварыш не быў надта знаёмы з такім феноменам, але пацікавіўся:

— Дык ты з'яўляешся грамадзянінам Польшчы беларускага паходжання?

А я, у сваю чаргу, палічыў лішнім усялякую казуістыку ў абставінах, калі на стале вабілі крыштальныя смакоцці — падтакнуў сябру.

Былі размовы і пра гераізм тадышняга палітычнага Алімпу, пра будаванне „Другой Польшчы”, пра яе месца ў першай дзесятцы сусветных перадавікоў. Да майго крытыцызму да гэтага энтузіязму Збышак — аўтар рэвалюцыйных вершаў — аднёсся вельмі недаверліва, але калі ў ходзе чарговых душашчыпальстваў мяне падтрымалі вонкавыя застольнікі „правільнага” паходжання — знаўцы нескладаных тэхналагічных хітрасцей — Збышку пакаціліся шчырапатрыятычныя слёзы.

На схіле мінулага года ўдалося мне пабываць у Варшаве і я пакарыстаўся нагодай, каб заглянуць у кнігарню Янкі Заброцкага. На адным са стэндаў заўважыў я міні-альбомчык, прысвечаны цэрквам Лэмкаўшчыны, а ўразіла мяне прозвішча яго аўтара — Шыман Барна. У вайсковым інтэрнацкім пакоіку геркаўскага перыяду пражывалі тры асобы... Трэцім з нас — буду эгаістам — быў менавіта Шыман Барна.

Шыман, які жыў разам са мною і Збышкам, меў мастацкія схільнасці і здалося, што я напаў на ягоны след. Дабрадушны Янка Заброцкі дапамог мне развеяць мае сумненні — аўтар фотаальбома аказаўся маім даўнім знаёмым. Пра тое, што ён лэмкаўскага паходжання, я раней не ведаў. Быў ён чалавекам надта ціхім, які заўсёды некуды ад нас ухіляўся. Ад маіх са Збышкам застольных шчыраванняў аднекваўся, а калі мы ўжо занадта насядалі на яго — мачыў вусны аб берагі чаркі. У той час я не кіраваў сваёй дапытлівасці на ягоныя паводзіны — ат, нейкі арыгінал пазбаўлены брацкаславянскай душы. Ды і цяпер не магу асядлаць той дапытлівасці: ці гэта акцыя „Вісла” пакінула ў ім такую атавістычную небрацкаславянскую насцярожанасць, ці мо ягоная мастацкая далікатнасць адводзіла яго ад хвалявання далікатнай Збышкавай рэвалюцыянерскай душы. Бо ж калі б Збышак пачуў, што поруч яго жывуць адно грамадзяне Польшчы іншага ад завучанага паходжання, мог бы апынуцца ў большым ад патрыятычнага плачу адчаі. А пакой наш быў на пятым паверсе...

Аляксандр Вярбіцкі

новыя вершы

Юрый Баена

Апошнія

Доўга ішлі мы пустымі,
бязлюднымі вуліцамі.
Чорнымі вачыма вокнаў
паглядалі хаты.
Шэлестам груш
адзічэлы сад клікаў.
Орды хмар полем
гналі смутак.
Ззаду ішоў снегапад.

Акружылі нас высокія
сцены холаду.
Дрэвы дрыжэлі, а боль
выкручваў галлё,
як рукі.
У цёмных завулках, як нянавісць,
шалеў вецер.

Ценем праміналі сны.
Ля разыходных дарог
стаялі крыжы памяці.
Сэрцы плакалі.
У самотнасці прападалі
гукі хору...

Уцалеў толькі шэпт, малітва.
Слова вечнае, дай нам паратунак!

* * *

У краіне зацьмення ружы
вецер забыцця
збудаваў свой гмах
з фата-марганай слоў,
з трыумфальнай аркай.

Каменным крокам
бег па дахах дождж.
Холад, быццам рака,
плыў праз край
да небакраю.

Над зялёнай дубровай
чорны птах
распяў крылы —
птушкі знямелі,
прапаў іх вырай.

Над палёў калыскай
з неба падаў ліст
за лістам...
Лажыўся змрок,
гусцела ноч мяцеліц.

* * *

Поўнач мінула. Не прыходзіць сон.
Поцемку шукаю сваіх берагоў.
Думкі на фронце.
Словы як кроў.
Лёс Айчыны — падскурная памяць.

Хаджу ад стала да акна,
Ад акна да стала.
Ныя душа.
Неспакой, пытанні... —

Дом мой стаіць на грані!

Генерал з Адногі

Усходняя Беласточчына багатая маляўнічымі краявідамі. Прыкладам гэтаму можа быць вёска Аднога. З аднаго боку аколеная яна старым сасновым лесам, з другога — сенажацямі, праз якія спакойна працякае Руднік, прыток Нарвы. Калісьці дзецюкі з Адногі на паплавах пасвілі кароў, а ў Рудніку — купаліся і лавілі ракаў. Сярод іх быў Міхал Полех — будучы генерал Войска Польскага.

Наш герой нарадзіўся 9 мая 1932 г. у сялянскай сям'і Мікалая і Феафілы Полехаў у вёсцы Аднога. Мішка змалку дапамагаў бацькам у гаспадарцы, хадзіў у школу ў Круглым Ляску, затым у Рыбаках, працягваў навуку ў сярэдняй прафесійнай школе ў недалёкім Міхалове.

Пасля ўрокаў і ў час канікул хлапчукі пасвілі кароў на сенажацях. Пастушкі з цікавасцю наглядалі за самалётамі, якія зрэдку з'яўляліся на блакітным небе.

— Эх, узабрацца б на яго, ды паглядзець уніз, — марыў смуглявы Мішка і вадзіў за самалётам вачамі, якія блішчэлі з-пад доўгага казырка бацькавай шапкі. — Адтуль нашы каровы, мабыць, малюсенькія бы мурашкі.

— Калі б яны былі такія як мурашкі, дык як ты пабачыў бы іх у траве з такой вышыні, — пярэчыў іншы пастушок.

Сярод хлапчукоў успыхвала спрэчка наконт таго, што можна, а чаго нельга пабачыць з самалёта. Ніхто з іх тады не ведаў як у сапраўднасці выглядае свет з самалёта, таму спрэчкі канчаліся нічым.

Калі Міхал Полех вучыўся ў другім класе прафтэхвучылішча ў Міхалове, школу наведаў прадстаўнік ваеннай авіяцыі, каб заахвоціць хлопцаў паступаць у Афіцэрскую школу лётчыкаў у Дэмбліне. Міхал Полех рашыўся адразу і восенню 1950 г. паступіў у Афіцэрскую школу лётчыкаў № 4 у Дэмбліне. Пасля заканчэння курсаў асноўнага пілатажу быў ён пераведзены на курсы знішчальнага пілатажу ў Афіцэрскую школу лётчыкаў № 5 у Радаме. Пасля іх заканчэння 30 снежня 1951 г. у званні харунжага стаў пілотам-знішчальнікам на самалётах „Як-9".

Службовая кар'ера Міхала Полеха пачалася ў 31 Палку знішчальнай авіяцыі на Бэмове ў Варшаве. Дзякуючы сваім камандна-авіяцыйным здольнасцям атрымоўваў чарговыя службовыя павышэнні. У верасні 1953 г. у званні падпаручніка стаў камандзірам эскадры, а ў студзені 1955 г. — намеснікам камандзіра палка па пілатажу. Пасля заканчэння ў кастрычніку 1956 г. авіяцыйна-тактычных курсаў у Ліпецку (СССР) быў пераведзены ў 21 Самастойны полк авіяразведкі ў Сахачэве на пасаду намесніка камандзіра па аператыўных справах. Належаў ён да ліку першых пілотаў абучаных на самалётах МіГ-21. У 1962 годзе 30-гадовы падпалкоўнік Полех стаў камандзірам гэтага палка.

* * *

Ліпецк — важнае месца не толькі ў службовым жыцці Міхала Полеха. Там на ваенным аэрадроме пазнаёміўся ён са сваёй жонкай Тамарай. Філігранная цёмнавалосая дзяўчына адразу спадабалася лётчыку з Польшчы. Аказалася, што ў яе польскія карані. Прадзед Тамары працаваў аканомам у маёнтку на Падоллі. Пасля 1945 г. яго сям'я засталася на Украіне. Бацька Тамары, Рыгор Бугай, быў ваенным лётчыкам і якраз служыў у Ліпецку.

* * *

У 1960-х гадах падпалкоўніка Полеха наведаў зямляк, тадышні журналіст „Нівы" Васіль Баршчэўскі. У ніўскім рэпартажы так апісаў ён супольную паднебную экскурсію:

— Ну, дружа, трымайся, — сказаў весела, падмірґваючы да мяне Міхась. Ён паварушыў рукой і самалёт уздрыгнуўся ад гуку матора. Рухнуў і, набіраючы хуткасці, паімчаў па дарожцы. Мне захапіла дух. У вачах пацямнела. Калі адрываліся ад зямлі, не пачуў. Толькі нейкая страшэнная сіла ўціснула мяне ў крэсла. І раптам палягчэла.

— Паглядзі ўніз, — пачуўся спакойны голас Міхася.

— Я глянуў. Пад намі, далёка ўнізе, хутка ўцякаў горад. Аэрадрома не відаць было. Мы зрабілі кола далёка за горадам і раптам я з правага боку пабачыў аэрадром з роўнымі радочкамі самалётаў, маленькіх як дзіцячыя цацкі. Ён хутка прыбліжаўся да нас.

— Прызямляемся, — сказаў Міхась. Мяне ізноў моцна, аж да болю, на гэты раз пачало выцягваць з крэсла. Напружыліся паскі, якімі я быў да яго прычэплены. Самалёт лёганька крануўся зямлі і плаўна пабег у бок навігацыйнага пункта. Над галавой шчоўкнулі і рассунуліся дзверцы. У галаве кружылася і шумела. (...)

— Ну і як? — спытаў Міхась.

— Пякельная машына! — выціснуў я дрыжачымі вуснамі.

(В. Баршчэўскі, *З Кузьмоў пад неба*, „Ніва" № 34 ад 25 жніўня 1963 г.).

* * *

Міхал Полех як майстар пілатажу прымаў удзел у шматлікіх паветраных паказах і парадах, у тым ліку ў вядомым парадзе з нагоды 1000-годдзя Польскай Дзяржавы. Тады, ў ліпені 1966 г. ляцеў ён над Варшавай на самалёце МіГ-21 у эскадрыллі „Грот".

У 1967-1971 гг. Міхал Полех быў слухачом Ваеннай авіяцыйнай акадэміі імя Юрыя Гагарына ў Моніна пад Масквой. Пасля заканчэння акадэміі пачаткова быў намеснікам камандзіра па аператыўных справах, а затым камандзірам 3-й Брандэнбургскай дывізіі штурмава-разведвальнай авіяцыі ў Свідвіне. А калі ў 1977 г. закончыў Вышэйшыя акадэмічныя курсы імя Клімента Варашылава ў Маскве, яго прызначылі намеснікам камандзіра Ваеннай авіяцыі па аператыўных справах у Познані, а з 1986 г. — намеснікам камандзіра па баявой падгатоўцы гэтага роду войск. Пасля аб'яднання авіявойскаў з вайскамі паветранай абароны краіны з 1 ліпеня 1990 г. знаходзіўся ў распараджэнні міністра абароны. Апошняй яго ваеннай пасадай быў пост шэфа Ваяводскага ваеннага штаба ў Беластоку ад снежня 1990 г. да лютага 1991 г.

Генерал брыгады Міхал Полех (генеральскае званне атрымаў ён у 1976 г.) усю сваю душу аддаў авіяцыі. Апекаваўся ён маладымі лётчыкамі, уводзіў у карыстанне сучасны знішчальнік-бамбардзіроўшчык Су-22, быў арганізатарам шматлікіх авіяцыйных мерапрыемстваў, апошнім з якіх было грандыёзнае „Air Show '91" у Познані. Па слядах бацькі пайшлі ягоныя сыны. Андрэй — маёр авіяцыі, да нядаўна лётаў на машынах Су-22, Павел — капітан, працуе пілотам у спецыяльным урадавым авіяпалку і не раз ляцеў з чарговымі прэзідэнтамі РП.

* * *

Генерала Міхала Полеха не стала 5 ліпеня 1999 г. На могілкі ў Белавежы правялі яго шматлікія жыхары Белавежы, Рыбакоў, Гайнаўкі, а эскадрылля самалётаў праляцела над адкрытай магілай. Развітальную прамову прачытаў тадышні камандзір авіяцыі ген. Казімеж Дзёк.

У першую гадавіну смерці самаўрадавыя ўлады прысвоілі яго імя вуліцы ў Белавежы.

У маёй памяці Мішка, з якім я вучыўся ў Рыбаках, застаўся як добры сябра, які, будучы ўжо афіцэрам, не цураўся роднай мовы і з вяскоўцамі размаўляў на мясцовай гаворцы.

Віктар Бура

Трывожны лёс

Успаміны Аляксандра ЗІНЧУКА, народжанага ў 1928 годзе ў Бацютах.

Аднойчы па вёсцы хадзіў ляснічы, пабачыў у мяне сырую драўніну і ўдаў немцам; апрача мяне папалася яшчэ шэсць чалавек — кожнаму з нас далі па тры месяцы карнага лагера. Як мяне забралі, то суседзі парасцягалі ўсё наша дабро.

Абоз у Старасельцах быў, у бараках, абгароджаных двума радамі дроту. Працавалі па 10-12 гадзін у суткі. Зрывалі старыя пуці і падымалі насып на паўтара метра. Кармілі супам з гнілой бульбы і мусіў есці. Некаторым з хаты прысылалі ежу і мне дваюрадныя браты раз у тыдзень прывозілі. На вартоўні правяралі пасылку і калі замнога было, тады адбіралі і давалі тым, што не даставалі пасылак.

Калі канчаліся тры месяцы майго тэрміну, падышоў фронт і нас адправілі ў Прусію: завезлі ў Біскупец, а там гаспадары паразбіралі нас. Мой гаспадар называўся Сакалоўскі, відаць быў знемчаным палякам, яму ў 1939 годзе пад Варшавай прастрэлілі ногі, было ў яго пяцёра дзяцей. Я ў яго ўсё рабіў — араў, касіў, даіў, кармію. Жыў я ў доме для парабкаў: у адной палове я, а ў другой уласаўская сям'я. У гаспадара працавала яшчэ дзяўчына з Ломжы.

Кармію мяне гаспадар тым, што і сам еў: меншага, чым сабе, куска мне не даў. Ён у пакоі еў, а я ў кухні, але дзверы адкрыты былі. Мой гаспадар добры быў, лепшы ад суседніх, але і ад яго чатырох работнікаў, што да мяне былі, уцяклі.

Калі набліжаўся фронт, гаспадара забралі ў апалчэнне. Гаспадыня выехала, і зараз саветы дагналі; яна паехала, а я вярнуўся ў маёнтак — стадола і абора ўжо былі спалены.

Мяне саветы на дарозе запынілі і ў зборны пункт забралі і дапытвалі; я не меў дакументаў. Калі не так адазвешся, то пад сцяну і трэба было так танцаваць, як гралі. Мяне аднаго цэлую ноч дапытвалі чатырох паліткуроў: пасля кожнага допыту было паўгадзіны адпачынку і чарговы допыт. І хто памыліўся, то і ўсё!

Мяне забралі ў вайсковы пункт, у лазню, абмундзіравалі. Хто раней у войску быў, таго ўжо на трэці дзень забіралі на фронт, а навічкоў падвучвалі. Два тыдні я ў Гумбінен вучыўся, дакладна пазнаёміўся з ружжом і гранатамі. Пасля забралі ў Ольштын, дзе размяркоўвалі і развозілі самаходамі ў франтавыя роты.

Мой батальён паехаў у Пілаў, а я астаўся ў Ольштыне, бо захварэў запаленнем лёгкіх і паўтара месяца ў шпіталі ляжаў; у той час кончылася вайна. 25 лістапада 1945 года маю часць вывезлі самаходамі ў Бабруйск; там у зямлянках запасны полк стаяў. Пасля трапіў у Добруш, а далей у Слуцк.

Дэмабілізавалі мяне 13 студзеня 1947 года. На праваслаўны Новы год заехаў я ў Ваўкавыск, да знаёмых, што туды з Бацют выехалі. Ад 14 студзеня да 24 лютага ў Ласоснай чакаў загрузкі эшалона. Раніцай выехаў з Ласоснай, а вечарам быў ужо на радзіме. Пераначаваў у хроснага, а раніцай у Бацюты прыйшоў, у нашай хаце голыя сцены... Жыў у ёй пагарэлец, якому хата згарэла калі праходзіў фронт. І так мы сталі жыць разам, пакуль той на сваім буду паставіў. Так жылі мо з два гады, на адной пліце варылі.

Банды па ночах хадзілі, грабілі коней, свіней, швейныя машыны, кажухі. Не было спакою, людзі баяліся, уцякалі. У нашай вёсцы асталося менш чым чацвёртая частка — апошнія выехалі ў Беларусь, у Расію, на цаліну. Сюды прыехалі з Беларусі, але і з іх мала ўжо хто астаўся; цяпер мазурня. У Зачарлянах да вайны амаль усе былі праваслаўныя, былі толькі тры польскія сям'і, а цяпер ніводнай праваслаўнай не асталося. І ў Гаёўніках ніводнай, а ў Завадах дзве.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі (2003 г.)

Нумізматыка на сённяшні дзень застаецца адным з сур'ёзных захапленняў тых, хто па манетах адкрывае для сябе гісторыю Бацькаўшчыны...

http://manety.h11.ru

Крыху больш за месяц таму „Ніва" пісала аб сайце, тэмай якога былі старадаўнія і сучасныя беларускія грошы. Як аказалася, нумізматыка на сённяшні дзень застаецца адным з сур'ёзных захапленняў тых, хто па манетах адкрывае для сябе гісторыю Бацькаўшчыны, яе месца ў гандлёвых і эканамічных стасунках не толькі Еўропы, але і Азіі. Бо аб тым, што на тэрыторыі заселенай нашымі продкамі можна знайсці манеты з далёкіх і старадаўніх арабскіх краін інтэрнэтны вандроўнік лёгка даведаецца дзякуючы сайту „Манеты ў гісторыі Беларусі".

Набраўшы адрас http://manety.h11.ru, на вашым маніторы высвеціцца цікава аздобленае выяўленне галоўнай старонкі сайта, якое складаецца з назвы на фоне помнікаў архітэктуры і старажытных манет, вялікага тэксту ад аўтараў-распрацоўшчыкаў ды пазначаных рубрык.

Што тычыцца вышэйзгаданага тэксту, то праз яго мы даведваемся, што сайт распавядае пра ўсе манеты, якія калісьці мелі абарачэнне на тэрыторыі Беларусі ад пачатку нашай эры і аж да падзелаў першай Рэчы Паспалітай. Менавіта гэтым даны сайт выгадна адрозніваецца ад апісанага раней „грашовага" сайта.

Пад загалоўкам-калажам і з левага боку галоўнай старонкі размешчаны рубрыкі. Усяго іх дзесяць. Калі кранацца тых, што пададзеныя непасрэдна пад загалоўкам, то як у сапраўдным канспекце па гісторыі яны пачынаюцца з рубрыкі „Перыяды". Націснуўшы на яе, мы выходзім да старонкі, дзе знаходзіцца апісанне манет, якія калі-небудзь пабывалі ў руках нашых продкаў. Уся гісторыя манет падзелена на перыяды, пачынаючы ад антычных манет і канчаючы манетамі 1733-1795 гадоў. Гэтая рубрыка адна з найцікавейшых, бо дзякуючы ёй можна даведацца не толькі аб назве той ці іншай манеты і пабачыць яе выяўленне, але і папоўніць эрудыцыю гісторыяй яе з'яўлення на беларускіх землях, суадносінах абмену да іншых грашовых адзінак.

Рубрыка „Гістарычны агляд" распавядае аб грашовых сістэмах, што цягам стагоддзяў дзейнічалі на нашай тэрыторыі. Перачытванне паданых тэкстаў, што называецца, зацягвае, бо напісаны яны вельмі простай і ў той жа час амаль навуковай мовай.

Рубрыка „Грашовыя двары ВКЛ" распавядае аб чатырох вядомых гісторыкам грашовых дварах Вялікага княства Літоўскага — віленскім, брэсцкім, ковенскім і гродзенскім, іх працы, асаблівасцях прадукцыі, адметнасці чаканкі.

„Слоўнік" падае тлумачэнні розных нумізматычных тэрмінаў, якія ўжываюцца ў тэкстах сайта. Усё тлумачыцца вельмі даступна і зразумела. Здзіўленне, праўда, выклікае тое, што слоўнік заканчваецца літарай С.

З рубрыкі „Спасылкі", якая стаіць першай з рубрык пададзеных з левага боку, мы можам не толькі даведацца аб падобных нумізматычных сайтах, але таксама выйсці на іх. Бо іхнія інтэрнэтныя адрасы падаюцца побач з апісаннем. На гэтай старонцы з правага боку ідуць навіны. Але апошнім часам распрацоўшчыкі не бяруць сабе за працу абнаўляць гэтую падрубрыку, таму апошняя навіна датаваная студзенем 2004 года.

З іншых пададзеных з левага боку рубрык сайта вартай увагі, хіба, ёсць толькі „Аб аўтарах". Аказваецца, гэта ўсяго дзве асобы, з якіх толькі адна цікавіцца нумізматыкай, захапленне другой — камп'ютэрная графіка.

Дадам, што сайт двухмоўны і ягоны змест можна прачытаць па-руску.

Уладзімір Лапцэвіч

Пасля распаду Савецкага Саюза Беларусь утварыла сваю нацыянальную лігу. Можна колькі заўгодна дыскутаваць пра яе ўзровень, але сваё ёсць сваё...

Беларусь, беларусы...

Сціплы, але свой

У той час, як ідзе футбольнае еўрапершынство, беларускі футбольны чэмпіянат не робіць перапынку. Сёлетні турнір ужо чатырнаццаты па ліку. Пасля распаду Савецкага Саюза Беларусь утварыла сваю нацыянальную лігу. Можна колькі заўгодна дыскутаваць пра яе ўзровень, пра майстэрства футбалістаў, якія выступаюць на палях Беларусі, але сваё ёсць сваё. Яго трэба цаніць і думаць, як палепшыць.

У першыя гады флагманства захоўвала мінскае „Дынама" — своеасаблівая „зборная рэспублікі". Цягам першых сямі чэмпіянатаў сталічны клуб выйграў 6 залатых узнагарод. Першай гегемонію мінчукоў спыніла мазырская „Славія" ў 1996 годзе (тады каманда выступала пад жахлівай абрэвіятурнай назвай МВКЦ). Пазней мазырцы здабылі яшчэ адзін чэмпіёнскі тытул. Два разы першым фінішаваў таксама барысаўскі БАТЭ, які ніжэй трэцяга месца ў розыгрышах яшчэ не апускаўся. Па адным разе чэмпіёнства здабывалі магілёўскі „Днепр", бабруйская „Белшына" і „Гомель".

У вышэйшай беларускай лізе выступаюць 16 каманд з 13 гарадоў. Усяго ж за суверэнны час праз першы дывізіён прайшло 29 клубаў. Некаторыя з іх ужо не існуюць.

Бягучы турнір надзвычай цікавы ў сэнсе інтрыгі. На чэмпіёнскі тытул рэальна прэтэндуюць адразу 5 каманд — мінскія „Дынама" і „Тарпеда-СКА", барысаўскі БАТЭ, жодзінскае „Тарпеда", салігорскі „Шахцёр". Шчыльным пелетонам яны ідуць на чале турнірнай табліцы, напэўна медальная інтрыга захаваецца да сама апошняга тура.

Сярод айчынных трэнераў варта вылучыць настаўніка моладзевай дружыны Юрыя Пунтуса (БАТЭ), маладога і перспектыўнага Юрыя Вяргейчыка, які зусім нядаўна заваяваў з салігорскім „Шахцёрам" Кубак Беларусі, экстравагантнага і афарыстычнага Якава Шапіру, які ачольвае жодзінцаў, нарэшце дасведчанага Аляксандра Башмакова, які здолеў зрабіць цікавы калектыў са сталічнага „Тарпеда".

Што датычыць яркіх гульцоў у беларускіх камандах, то іх не так шмат. Але зоркі мясцовага маштабу ёсць. Так што галоўнаму трэнеру зборнай Беларусі Анатолю Байдачнаму ёсць з каго выбіраць пры камплектаванні нацыянальнай дружыны. Пасля некалькіх гадоў занядбання ў маскоўскім „Спартаку" ў Беларусь вярнуўся Раман Васілюк, аўтар чатырох галоў у браму зборнай Польшчы ў адным матчы. Васілюк выступае за сваё роднае берасцейскае „Дынама" і зараз ачольвае спіс лепшых бамбардыраў чэмпіянату. З іншых айчынных галеадораў трэба згадаць форварда „Гомеля" Генадзя Блізнюка, навапалачаніна Валерыя Стрыпейкіса, які забіў больш 100 галоў у чэмпіянатах Беларусі, Арцёма Ганчарыка, які выступае за салігорцаў, Уладзіміра Макоўскага, які пасля няўдалых блуканняў па Украіне і Расіі, гуляе за мінскіх тарпедаўцаў і спакваля вяртае былы спрыт. Іншыя яркія асобы — галкіпер гродзенскага „Нёмана" Аляксандар Суліма, абаронец БАТЭ, які да ўсяго ўмее забіваць, Валерый Тарасенка, шматвопытны Юрый Шуканаў, які і гуляе, і ёсць галоўным трэнерам мінскага „Дынама".

Легіянераў у Беларусі не так шмат. Найбольш адметная постаць — бразілец Эду, лепшы снайпер „Тарпеда-МАЗ". У гэтым жа клубе выступае экзатычны албанскі галкіпер Жуліян Г'елашы. Сярод заезджых гастралёраў пераважаюць украінцы і расійцы, як правіла тыя, што не змаглі працаўладкавацца ў сваіх краінах. Традыцыйна і прынцыпова без варагаў абыходзіцца барысаўскі БАТЭ.

За апошнія гады рэканструявана бальшыня стадыёнаў краіны, некаторыя арэны пабудаваныя наноў. Сярэдняя колькасць наведнікаў аднаго матча — прыблізна дзве тысячы чатырыста заўзятараў. Да восені гэтая колькасць напэўна павысіцца.

Між тым футбольныя легіянеры з Беларусі адпачываюць пасля напружанага сезона. Лепшы беларускі футбаліст апошняга дзесяцігоддзя Валянцін Бялькевіч прывёў да чарговага чэмпіёнскага трыумфу кіеўскае „Дынама". Бялькевіч уганараваны тытулам лепшага футбаліста першынства Украіны. Днямі 31-гадовы плеймейкер беларускай дружыны ўзяў шлюб. Бялькевіч, які па традыцыі пазбягае журналістаў, ажаніўся з вакалісткай вядомай украінскай поп-групы „ВІА Гра".

Уладзімір Хільмановіч

Памяці Міколы Врублеўскага

Два гады таму памёр настаўнік фізкультуры Гайнаўскага белліцэя Мікола Врублеўскі. Раней, як трэнер валейбольных каманд белліцэя, дабіўся ён поспехаў на ўзроўні ваяводства і краіны. Ягоны вучань Раман Данілюк, які працуе настаўнікам фізкультуры ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, выступіў з прапановай арганізаваць валейбольныя спаборніцтвы ў гонар памерлага трэнера. Сёлета ў II Мемарыяле імя Міколы Врублеўскага, які 21 мая праходзіў у спартыўнай зале белліцэя, перамаглі гайнаўскія белліцэісты. Раней гэтая самая каманда заняла трэцяе месца ў змаганнях за кубак Падляшскага ваяводы.

— У чэрвені горш сабраць вучняў і таму спаборніцтвы прымеркавалі мы да святкаванняў у гонар свяціцеля Мікалая, што адбываліся на наступны дзень, — кажа Раман Данілюк. — Думаю, што варта арганізаваць спаборніцтвы імя Міколы Врублеўскага, бо яго заслугі — аграмадныя. Выдатна спрычыніўся да поспехаў гайнаўскага валейбола, спачатку жаночага, а пасля мужчынскага. Усе гайнаўскія трэнеры-валейбалісты — яго выхаванцы. Мікола Врублеўскі працаваў у белліцэі і таму мы арганізуем спаборніцтвы.

У адкрыцці і закрыцці спаборніцтваў удзельнічалі ўдава па трэнеры Ірэна Врублеўская, намеснік дырэктара белліцэя Аляксандр Лаўрыновіч і гайнаўскія трэнеры, якія працавалі з Міколам Врублеўскім. Валейбольная каманда белліцэя перамагла ва ўсіх матчах з вынікам 2:0. Другое месца занялі валейбалісты Комплексу прафесійных школ з Гайнаўкі, трэцяе — ігракі Комплексу школ н-р 4 у Бельску-Падляшскім, а чацвёртае — гімназісты з Белавежы. У пераможнай камандзе белліцэя, якой трэнерам з'яўляецца Раман Данілюк, выступілі Матэвуш Юшчук, Марыюш Пташынскі, Марцін Пашкоўскі, Андрэй Мароз, Лукаш Самусевіч, Артур Свентахоўскі, Уладзіслаў Якубоўскі, Марыюш Панькоўскі і Андрэй Гілеўскі. За выдатную ігру ўзнагароджаны быў Марцін Пашкоўскі.

Калі валейбольная каманда перамагла ў спаборніцтвах за кубак Падляшскага ваяводы, трэнерам белліцэістаў быў Юрый Янель, які выдатна спрычыніўся да поспехаў сваіх вучняў.

Аляксей Мароз

Белліцэісты з сённяшнім трэнерам Раманам Данілюком (злева); сярод вучняў — трэнер Аляксандр Сегень

Мікола Врублеўскі (1940-2002) нарадзіўся ў Малешах на Бельшчыне. Пасля заканчэння мясцовай падставовай школы вучыўся ў Педагагічным ліцэі ў Бельску-Падляшскім і Настаўніцкай школе ў Элку. У 1964 годзе распачаў працу ў Гайнаўскім белліцэі як настаўнік фізкультуры. Ужо два гады пазней яго валейбалісткі дайшлі да паўфінальных спаборніцтваў арганізаваных на ўзроўні краіны. Пасля яго выхаванцы перамагалі ў валейбольных спаборніцтвах у Беластоцкім ваяводстве і іграліў паўфінальных матчах на ўзроўні краіны. Некаторыя з іх выступалі ў камандзе II лігі. Мікола Врублеўскі быў узнагароджаны Польскім валейбольным саюзам і атрымаў адзнаку „Заслужаны Беласточчыне". Многія гайнавяне прагаласавалі за яго ў час конкурсу на найлепшых трэнераў Гайнаўшчыны XX стагоддзя (заняў II месца).

ШАФРАН ДЫ ПЕРАЦ

Летнія дні гэта найлепшы час, каб скарыстаць з багацця нашых агародаў і варыць у кухні здаровыя і смачныя стравы. На гэты тыдзень прапаную чытачам стравы, падрыхтоўка якіх не займае шмат часу. Вашу ўвагу звяртаю на салодкія дэсерты з трускалак.

Іспанскі суп з часнаку

Прадукты: 8 зубкоў часнаку, 2 лыжкі расліннага масла, 2 лыжкі салодкага чырвонага перцу, 1,5 літра курынага булёну, соль і перац да смаку, 4 яйкі, пятрушка.

Выкананне: Абабраць часнок і кожны зубок раскроіць на палавіну. Разагрэць масла і падсмажыць на ім часнок на залаты колер, пасля перакласці на талерку. У гаршчок з маслам усыпаць чырвоны перац і падсмажыць яго, безупынна мяшаючы. Уліць булён, дадаць часнок, даправіць соллю і перцам. Варыць яшчэ 4 мінуты на невялікім агні. У другім гаршку зварыць укрутую 4 яйкі, абабраць, пакроіць у костачку і дадаць у суп. Суп пасыпаць зялёнай пятрушкай.

Курыца ў апельсінах

Прадукты: 4 вялікія курыныя кумпячкі, соль, перац да смаку, 3 лыжкі расліннага масла, 1 вялікая цыбуліна, 3 зубкі часнаку, 2 морквы, лыжка мукі, лаўровы ліст, апельсін, лыжка воцату, паўлітра белага сухога віна.

Выкананне: Курыныя кумпячкі нацерці соллю і перцам. Пасячы цыбулю, часнок, моркву, апельсін абабраць і пакроіць у скрылёчкі. Кумпячкі падсмажыць на раслінным масле. Абкласці цыбуляй, часнаком і морквай. Падсмажыць, пасыпаць крышку мукой, дадаць лаўровы лісток і апельсін. Прыкрыць і пячы 30 мінут у тэмпературы 225 градусаў. Уліць віно і пячы яшчэ 40 хвілін у тэмпературы 200 градусаў. Пасля выняць кумпячкі і моркву з брытвана. Соус, які астаўся ў брытване працадзіць цераз сіта, заварыць, дадаць прыправы і воцат. Такім соусам паліць курыныя кумпячкі, абкласці морквою і скрылёчкамі апельсіна.

Сырнік з трускалкамі

Прадукты: 8 яек, 250 грамаў трускалак (могуць быць марожаныя), 1 і 1/3 шклянкі мукі, паўтары шклянкі цукру, 2/3 косткі сметанковага масла, 500 грамаў тварагу, 2 пачачкі ванільнага цукру, лыжка крухмалу, лыжка лімоннага соку, лыжка цукровай пудры.

Выкананне: Бялок аднаго яйка аддзяліць ад жаўтка. Міксерам вымяшаць 200 грамаў мукі, 50 грамаў цукру, 2/3 сметанковага масла, адзін жаўток і лыжку пераваранай халоднай вады. Энергічна загібаць цеста, завінуць у фольгу і на 30 мінут пакласці ў халадзільнік. Выняць цеста з халадзільніка, развалкаваць і пакласці ў бляху, завінуўшы берагі на вышыню 4-5 сантыметраў. Накалоць відэльцам спод цеста. Прыкрыць паперай і пячы 20 мінут у духоўцы ў тэмпературы 200 градусаў. Зняць паперу. У той самы час, калі цеста пячэцца, збіць 6 бялкоў з 3 лыжкамі цукру. Далікатна вымяшаць з 7 жаўткамі, тварагом і рэштай цукру. Дадаць ванільны цукар, муку і крухмал. Уліць стопленае масла. Палавіну масы палажыць на падпечанае цеста і наверсе разлажыць трускалкі. Прыкрыць другой палавінай сыравай масы. Пячы 40 мінут у тэмпературы 170 градусаў. Два апошнія бялкі ўзбіць на пух з рэшткай цукру і апельсінавым сокам. 10 хвілін перад заканчэннем пячэння выняць сырнік і пакласці на верх узбітую пену. Пячы да канца (разам 40 хвілін).

Марожаныя трускалкі

Прадукты: 400 грамаў трускалак, лыжка цукровай пудры, 2 лыжкі белай гарэлкі, 3 жаўткі, 6 лыжак цукру, брус белага сыру (тварагу).

Выкананне: Трускалкі пачысціць. Некалькі штук адкласці для дэкарацыі, рэшту ўсыпаць у місачку, пасыпаць цукровай пудрай, паліць гарэлкай. Адставіць на 15 хвілін. Пасля зміксаваць. Жаўткі перакласці ў місачку і дадаць 5 лыжак цукру. У гаршку заварыць ваду, місачку з жаўткамі паставіць на пару. Узбіваць міксерам на густую пушыстую масу. Астудзіць. Тварог сцерці са зміксаванымі раней трускалкамі. Дадаць масу з жаўткоў, далікатна ўсё вымяшаць і перакласці ў чарачкі. Адкладзеныя трускалкі пасыпаць цукрам і пакласці на верх масы. Уставіць у халадзільнік. Падаваць халоднае.

Смачна есці!

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Хто задбае?

Пры ўваходзе ў Гмінны дом культуры ў Чаромсе над агароджай знаходзіцца рэкламная табліца з рэкламай прыватнай радыётэлевізійнай майстэрні. Гэты пункт арганізаваўся пры камуне. Жыхары пасёлка і навакольных вёсак складалі заявы ў ГОК, а майстар з Гайнаўкі прыязджаў кожную пятніцу і ездзіў па ўказаных адрасах ды рамантаваў радыётэлевізійную тэхніку на кватэры або забіраў у майстэрню ў Гайнаўку. Многія карысталіся паслугамі радыётэхніка, паколькі ў Чаромсе не было пастаяннай майстэрні. Так яно і зараз. Прадпрымальніку належыцца пашана, аднак ёсць маленькае „але". Рэклама знаходзіцца ў жалюгодным стане. Чарамшане звыкліся з неахайнай рэкламай, але прыезджым гэтая візітная картачка неадпаведная. Хто задбае пра тое, каб кашмарная шыльда знікла з вонкавага выгляду чаромхаўскага цэнтра культуры? **(ус)**

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ДАМ ПРАЦУ

• Прыму на практыку маладую цырульціцу, тэл. 0 606 994 639.

• Шукаю машыннага электрамеханіка, добрыя ўмовы працы, тэл. 676 05 88.

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Выпускніца англістыкі шукае працу ў Беластоку, абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 608 885 261.

• Маладая жанчына, вышэйшая педагагічная адукацыя, веданне камп'ютэра, вопыт у працы ў бюро, шукае працу ў Беластоку (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 503 713 915.

• Студэнт шукае працу ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, уласная машына, абслуга камп'ютэра, апратыўны (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 606 431 022.

• Жанчына, 49 гадоў, пільна патрабуе працу, ахвотна прыбярэ, смачна зварыць, Беласток, тэл. 661 15 92.

• Мужчына, 31 год, правы кат. В, вопыт у будаўнічых працах, тэл. 651 09 80.

• Пекар з сярэдняй адукацыяй, веданнем практыкі продажу шукае працу ў Беластоку, тэл. 653 31 62.

• Маладая жанчына з вышэйшай эканамічнай адукацыяй, абслуга камп'ютэра, добрае веданне англійскай мовы, правы кат. В, вопыт у працы настаўніка, тэл. 0 601 093 284.

• Студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, санітарны мінімум, кніжка здароўя, правы кат. В, добрае веданне нямецкай мовы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 693 332 218.

• Інжынер-будаўнік (30 гадоў), вышэйшая адукацыя, будаўнічыя правы, неадкладна патрабуе працу ў ваколіцах Бельска-Падляшскага, тэл. 0 508 628 196.

• Маладая жанчына, рэферэнт у аддзеле продажу, уласная грузавая машына, сярэдняя адукацыя, стаж працы ў гандлі, веданне камп'ютэра і абароту гандлёвых дакументаў, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 602 769 109.

• Мужчына (36 гадоў), тэхнічная адукацыя, уласная грузавая машына, шукае працу ў Падляшскім ваяводстве, тэл. 0 608 151 776.

• Апякунка дзяцей, вопыт працы за мяжой, спакойная, без дрэнных схільнасцей, тэл. 0 603 727 489.

• Бухгалтар з вопытам, правы кат. В, абслуга камп'ютэра, веданне фіскальнай касы, шукае працу ў Бельску, тэл. 0 696 120 667.

• Студэнтка-завочніца заапякуецца дзіцём у ранніх гадзінах, добрае веданне англійскай мовы, абслуга камп'ютэра, без дрэнных схільнасцей, тэл. 0 601 240 086.

• Маладая жанчына танна прыбярэ кватэру, памые вокны, смачна зварыць, тэл. 0 501 081 637.

• Жанчына (25 гадоў), спецыяліст па справах маркетынгу і продажу — вышэйшая адукацыя, веданне камп'ютэра, добрае веданне рускай мовы і тэхнічнай тэрміналогіі, пільна шукае працу, тэл. 0 503 713 915.

• Мужчына пасля службы ў арміі, сярэдняя інфарматычная адукацыя, пільна шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 508 764 743.

• Сумленны мужчына (32 гады), кніжка здароўя, правы кат. В і на абслугу аўтапагрузчыкаў, уласная машына, вопыт, тэл. 0 605 358 382.

• Мужчына (37 гадоў), механік з вопытам, шукае працу ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, С, тэл. 0 604 960 657.

• Студэнт шукае працу ў Беластоку, свая машына, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, шмат вольнага часу (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 606 431 022.

• Мужчына (35 гадоў), сярэдняя адукацыя, 16 гадоў працаваў сталяром, правы кат. В, уласная машына, свая майстэрня і матэрыялы, шукае новых кліентаў зацікаўленых апрацоўкай хат у драўніне, арганізацыяй забудовы панадворкаў, індывідуальны падыход да кожнага кліента, вялікі вопыт у царкоўным будаўніцтве, тэл. 730 33 89 (Бельск-Падляшскі).

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 730 20 06

• Сям'я патрабуе летняга адзення для дзяцей ва ўзросце 11-13 гадоў.

• Сям'я, якая выхоўвае двое хворых дзяцей, патрабуе лёгкага адзення, пледаў, пасцелі.

• Бедная сям'я будзе ўдзячная за ўсякую помач.

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Сям'я з чатырма дзяцьмі патрабуе старой мэблі і летняга адзення для дзяўчат ва ўзросце 5, 6 і 9 гадоў.

• Сям'я, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе летняга адзення і цацак для дзяцей.

• Сям'я з дзесяці асоб патрабуе пледаў, пасцелі, лёгкага адзення для дзяцей.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Накład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2004 r. upływa 5 września 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

У псіхіятра:

— Калі кладуся спаць, — расказвае хворы, — здаецца мне, што нехта ёсць пад ложкам. Злажу тады пад ложак, а тады здаецца мне, што нехта ляжыць на ложку. І так праз усю ноч; я хіба здурэю!

— Я вас вылечу, толькі праз год прыходзьце да мяне па тры разы ў тыдзень.

— А колькі гэта будзе каштаваць?

— Дзвесце злотаў за візіт.

— Падумаю, — сказаў хворы і пайшоў.

Праз паўгода сустрэліся яны на вуліцы, псіхіятр пытае:

— Чаму вы зусім да мяне не прыходзіце?

— За шасцьсот злотаў у тыдзень? Вы хіба здурэлі! Швагер вылячыў мяне дарам.

— Гэта цікава. А якім чынам?

— Падрэзаў ногі ў ложку.

* * *

Псіхіятр тлумачыць пацыентцы:

— Вашы праблемы выплываюць з таго, што вы празмерна хвалюецеся за свайго сынка і ўсюды за ім ходзіце. Дам вам такія супакойваючыя пілюлькі, пасля якіх перастанеце так хвалявацца.

Пасля двух тыдняў пацыентка вяртаецца да кантролю.

— Падзейнічалі таблеткі? — пытае лекар.

— Выдатна!

— А дзе сынок?

— А хто яго ведае!

* * *

У перапоўнены аўтобус уваходзіць пажылая жанчына. Нейкі хлопец саступае ёй месца.

— Сядзі, сыночак, — адказвае яна, — настаішся яшчэ, як пастарэеш.

* * *

Між бландзінкамі:

— І які гэты твой новы нарачоны?

— Цудоўны! Найперш купіў мне ружы, пасля пярсцёнак, далей кажушак, а ўчора папрасіў маю руку.

— Відаць выйшлі яму грошы.

* * *

Да сексуолага прыходзіць бландзінка. Ледзь увайшла, лекар кінуўся на яе, сарваў вопратку... Пасля ўсяго прылізаў валасы і кажа:

— Я сваю праблему ўладзіў. А якая праблема ў вас?

* * *

Пажылы мужчына звяртаецца да юрыста:

— Хачу напісаць запавет, ды не ведаю як гэта зрабіць.

— Не турбуйцеся, пакіньце ўсе справы мне.

— Ведаеце, шчыра гаворачы, дык хачу крыху пакінуць яшчэ дзецям і ўнукам.

* * *

Па аўтастрадзе едзе бландзінка і чуе па радыё:

— Перадаем паведамленне паліцыі. На аўтастрадзе паявіўся адзін дарожны пірат, які едзе супраць руху!

— Божа мой, — адзываецца бландзінка, — каб толькі адзін; тут усе едуць супраць руху.

* * *

Муж прапануе жонцы:

— Мо сёння вечарам памяняем пазіцыю?..

— Згода, я здаўна пра гэта думала! Сёння ты станеш за ракавінай з пасудай, а я паляжу на тапчане перад тэлевізарам.

Басовішча 2001

Музычныя навіны

Басовішча 2004

А. Памідораў і В. Корань атрымалі заяўкі ад 25 гуртоў: „Taxi" (Мінск), „Zvik" (Гомель), „Deadmarsh" (Мінск), „Black Sugar" (Пінск), „Victima" (Мінск), „[bi:p]" (Мінск), „S. K. D.", „Green-Witch" (Мінск), „Core-seth" (Мінск), „Сонцаварот" (Мінск), „Чалавек з разынкамі" (Мінск), „Тарпач" (Мінск), „Аніма" (Мінск), „Пульс вакол" (Мінск), „Фляўс і Кляйн" (Наваполацк), „Тлуста-Луста" (Гродна), „Алмазны фронт" (Віцебск), „Зелень дарог" (Віцебск), „Evtanazia" (Мінск), „Imprudence" (Мінск), „Тезаўрус" (Мінск), „Homo Erectus" (Гомель), „Dias" (Мінск), „Змяя" (Мінск), „Soulside" (Мінск). Адборачны канцэрт — 30 чэрвеня, альбо 10 ліпеня. Гурты, не прайшоўшыя ў конкурсную частку альбо не паспеўшыя падаць заяўку на ўдзел у фестывалі, могуць паехаць у якасці ўдзельнікаў конкурсу на адкрытай сцэне. Афіцыйная старонка фестывалю: www.basowiszcza.org

Аляксандра і Канстанцін

Як паведаміў Канстанцін Драпеза, нягледзячы на няўдачу дуэта на „Еўравізіі", цікавасць да іх творчасці не згасла, таму было вырашана выдаць дыск з лепшымі песнямі. Туды ўвойдуць песні з двух нумарных альбомаў калектыву — „За ліхімі, за марозамі" і „Сойка", а таксама „Мой Галілей", „Каляда-калядзіца" (яна ратавалася толькі на „Тузіне гітоў") і тры рускамоўныя творы.

Канстанцін Драпеза абверг чуткі, што дуэт пераходзіць на рускамоўную творчасць: «Гэтыя тры песні — „Лети", „Девочка-весна", „Отпусти" — былі напісаны яшчэ падчас працы над першым дыскам, але ў нашыя альбомы яны не ўваходзілі, таму мы вырашылі паказаць іх публіцы». Даць вялікі сольны канцэрт дуэт плануе ў верасні, калі распачнецца новы канцэртны сезон.

Татка Стэп

Афарызмы Ладзіка Майніча

Парадоксы

Людзі заўсёды маладыя на старых фотаздымках.

Вядома, што сама невыносная рэч — гэта нявядомасць.

Сама канструктыўная дыскусія — маўклівая.

Шчаслівыя імгненні ўзгадваюцца доўгія гады.

З вышыні буслінага палёту жабе раем здаецца балота.

Сучасны беларус у горадзе адчувае сябе вяскоўцам, а на вёсцы пачуваецца гараджанінам.

Кароткія спадніцы працяглы час прыцягваюць увагу.

N. быў натурай супярэчлівай: пасля кепскіх учынкаў у голаў яму заўсёды прыходзілі добрыя думкі.

Бязлюдная выспа — гэта востраў свабоды ад чалавека.

Ляжаць на бруднай падлозе намнога прыемней, чым вісець пад белай столлю.

Адгаданка

Акно ў свет

(анаграмная шарада)

Пілот мой, таварыш мой мілы,
Вазьмі ты з сабою мяне;
З мяне баявіты граміла,
Гатовы пашарыць у свет.
З табою я добра знаёмы,
Твой штурвал трымаю ў руках,
Ракетаю я ў трэнажоры
Лятаю ў вярхоўных вярхах:
*Дзе наша **ЭЛІТА** — анёлы,*
*Адзін да другога — як **ЗВЕР**...*
Клыкамі клыкаюць бадзёра,
Гадзючаць у шкляным акне.
Я трызню гарача — на шкляным экране
Анёлам-арлом загрымець!
Пілот мой, мой мілы таварыш,
Знаём ты з элітай мяне! **(ш)**

З літар патоўшчаных слоў скласці рашэнне з першымі літарамі і іх лікам у паасобных адгадваемых словах: **Т-9**.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 21 нумара

Капуста, Вільня, іскра, Орша, бюро, пасека, Гайнаўка.

Рашэнне: **Аляксей Карпюк, Страшава.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

4.07 – 10.07



Баран (21.03. — 19.04.) Ідзі за голасам сэрца, дазволь сабе на любоўныя шаленствы. Прыемныя ды кайфуючыя неспадзяванкі. Шанцы ў фінансах. Памятай, што ты, а не твая натура, кіруеш тваім жыццём.

Бык (20.04. — 20.05.) Адкрыюцца перад табою новыя гарызонты, лягчэй справішся са штодзённымі абавязкамі. Для прафесійнай прапановы варта перакласці тэрмін адпачынку.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Знакамітыя стасункі з сябрамі, сям'ёй, задавальненне ў адносінах з партнёрам. Людзі цябе любяць. Поспехі ў судовых справах. Займіся сабою, палянуйся ўволю.

Рак (22.06. — 22.07.) Карысны час пачаць новую дзейнасць. Сімпатыя атачэння. Патаемныя любоўныя сувязі хутка рассакрэцяцца; могуць быць прыкрасці. Пашанцуе табе трапіць на чалавека, які будзе майстрам твайго жыцця.

Леў (23.07. — 22.08.) Вялікая энергія. Будзеш як магніт прыцягваць да сябе людзей, перш за ўсё вясёлую кампанію. Твае грошы і пачуццё гумару з'яднаюць табе новых сяброў. У час кан'юнкцыі Сатурна да Сонца (7.07. — 10.07.) прыйдзецца табе адплаціць за здзейсненыя памылкі. Старайся тады не прымаць важных рашэнняў.

Дзева (23.08. — 22.09.) Ад жарсці да нянавісці — адзін крок. Не ўсе планы ўдасца здзейсніць, справы будуць вырывацца з-пад кантролю. Лепш выберыся на доўгі адпачынак. У фінансах — застой.

Шалі (23.09 — 23.10) Нявінны флірт можа адмяніць тваё жыццё. Праца ахопіць цябе без рэшты. Канцэнтруючыся на ёй, пабудуеш салідны падмурак на будучыню. Пі штодзень адну таблетку магнія.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Любоў не будзе цяпер табе засланяць свету. 5.07. — 9.07. — глыбокія роздумы над таямніцамі жыцця і смерці. Напругі ў сям'і. Лёс рыхтуе табе падарунак з дастатковай колькасцю нулёў.

Стралец (22.11. — 21.12.) Будзеш мець павагу і сімпатыю ад атачэння. Калі ёсць у цябе палітычныя амбіцыі, можаш паказацца. Гэтыя канікулы застануцца надоўга ў тваёй памяці.

Казярог (22.12. — 20.01.) Кан'юнкцыя Сонца з Сатурнам (6.07. — 9.07.) будзе спрыяць у важных жыццёвых рашэннях, адказнасці, сумленнасці і ўмеласці кіраваць іншымі. Твае пачуцці ўвесь ліпень будуць кіпець.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Сапраўдная любоў дасць крылы нават у крызіс. Можаш мець шчасце ў іграх. Больш абавязкаў, чым заўсёды. Візіты сваякоў. Глядзі ў будучыню з надзеяй, нават калі цябе моцна пакрыўдзілі ці ты пацярпеў страту.

Рыбы (20.02. — 20.03.) Будзеш мець шмат працы, але і многа творчых ідэй. Сямейная гармонія. Прыцягваць будуць цябе людзі вучоныя, інтэлектуалісты. Шукай дапамогі ў жанчын, старэйшых і вопытных. Часам варта навучыцца гаварыць „не". Будзь асцярожны з сонцам і вострымі прыладамі.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960